№ 32 (677) 25 жніўня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**«У гасцях у кандыдата»: Яраслаў Раманчук**

Старонка 12



**Каштоўныя набыткі Урала Латыпава**

Старонка 4



**У Беларусі пачалі даіць мышэй**

Старонка 8

## У НУМАРЫ

**Янукевіч: Саннікаў выдаў сябе з галавой**

Апазіцыя размяжоўваецца па лініі сувязяў з Расіяй. **Старонка 2.**

**Ротны коннай паліцыі Вільні ў беларускай турме**

Лайманас Банкаўскас быў затрыманы на літоўска-беларускай мяжы пры спробе перавесці з сабой наркатычныя рэчывы. **Старонка 3.**

**Нью-Ёрк, дыскутаваць і васямнаццаць**

З 1 верасня ўступаюць у сілу новыя правілы школьнай арфаграфіі. **Старонка 5.**

**Радзіма катоў**

Генафонд нашых катоў сфармаваўся ў X—XII ст. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
**«ГІСТОРЫЯ-ТУР»**
- **Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010** (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- **Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі**
- **Адпачынак у Еўропе і на моры**
- **Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах**
(029) 677 00 46 www.h-t.by
УНП 590883064. Ліц. № 02310/0531453 г. МСіТ выд. 21.09.2009 да 21.09.2014

# Дамова калектыўнага ігнаравання

На саміце АДКБ ніхто не захацеў сустрэцца з Лукашэнкам.

### Напружанасць з Атунбаевай

Нефармальны саміт АДКБ у армянскай сталіцы — гэта ўжо чацвёртая падобная сустрэча. Мінулыя адбываліся ў Казахстане і Кыргызстане, а сёлета ў маі неафіцыйны злёт прэзідэнтаў вайсковага блока адбыўся ў Маскве.

У Лукашэнкі свая гісторыя ўзаемаадносін унутры АДКБ. Летась у самы разгар «малочнай вайны» з Расіяй кіраўнік Беларусі адмовіўся ляцець у расійскую сталіцу, дзе павінны былі падпісаць пагадненні аб калектыўнай бяспецы. Дарэчы, тыя дамовы праігнараваў таксама і прэзідэнт Узбекістана Іслам Карымаў, незадаволены размяшчэннем расійскіх вайсковых базаў паблізу ўзбекскай граніцы.

Лукашэнка хоць і ўставаў на дыбкі, але ўсе паперы падпісаў. А вось Карымаў не ратыфікаваў пагадненняў па сёння. Не прыехаў ён і ў Ерэван.

Затое ўпершыню на падобнай сустрэчы прысутнічала новая прэзідэнтка Кыргызстана Роза Атунбаева. Хоць гэты факт мог бы стаць скандальным, бо ў Беларусі працягвае знаходзіцца зрынуты прэзідэнт гэтай сярэднеазіяцкай краіны Курманбек Бакіеў. Афіцыйны Бішкек дабіваецца экстрадыцыі Бакіева, але Мінск, фармальна саюзнік па АДКБ, адказвае адмовамі.



REUTERS

У Ерэване Лукашэнка выглядаў як у ваду апушчаны.

### Каньяк у гонар Колі Лукашэнкі

У Ерэван Лукашэнка прыбыў яшчэ за некалькі дзён да спаткання. Ні беларускія, ні армянскія СМІ не паведамлялі, што ж рабіў у гэты час кіраўнік дзяржавы. Толькі потым стала вядома, што гэтыя два дні ён правёў у кампаніі было прэзідэнта Арменіі Роберта Качарана.

Памятаецца, што летась у сакавіку Лукашэнка ўжо адпачываў у Арменіі. Ён катаўся на лыжах у мястэчку Цахкадзор, што недалёка ад Ерэвана, якраз у кампаніі Качарана. Той адпачынак быў замаскіраваны пад афіцыйны візіт.

**Працяг на старонцы 3.**



PROSTO-PRO.LIVEJOURNAL.COM

**Дажынкі — гэта не калі жнуць, а калі плітку кладуць.**

# Дажынкі за 350 мільярдаў. Ці варты яны таго?

Сёлета дзяржава патраціць на Дажынкі на 70 мільярдаў рублеў больш, чым ў мінулым годзе. З кожным годам святкаванне абыходзіцца даражэй. Так, на першыя Дажынкі, што праходзілі ў Століне, было выдаткавана каля 10 мільярдаў рублеў. Ці трэба пампезна праводзіць Дажынкі, мы запыталіся ў жыхароў Гродна. І на што лепш было б выдаткаваць грошы?

**Павал:** У нас грошай больш няма куды траціць, ці што?

На будаўніцтва жытла. Вось куды трэба выдаткоўваць грошы.

**Дзве жанчыны:** — Я, напэўна, думаю што не. Я думаю, што ёсць больш...

**Яе перапыняе сяброўка, больш сталая за яе:**

— Так. Частка пойдзе на добраўпарадкаванне горада.

**Тады жанчына дадае:**

— Тая частка, якая пойдзе на добраўпарадкаванне горада, напэўна, гэта карысна. А тая частка, якая пойдзе на само свята, я думаю, што гэта ўсё прыходзіць і сыходзіць. Я б, напэўна, прымаючы гасцей, падумала б, што мне важнейшае ў дадзены момант – сацыяльнае штосьці альбо свята.

**Працяг на старонцы 7.**

# Януkевіч: Саннікаў выдаў сябе з галавой

## Апазіцыя размяжоўваецца па лініі сувязяў з Расіяй.

БНФ прапанаваў кандыдатам у прэзідэнты падпісаць «Маніфест абабароне нацыянальных інтарэсаў». Першым адмовіўся Саннікаў.

Тэкст маніфеста быў разасланы заказнымі лістамі ўсім кандыдатам на прэзідэнцкае крэсла. Дакумент атрымаўся жорсткім, БНФ такім чынам паспрабаваў размежаваць, хто спадзяецца на дапамогу Расіі, а хто не.

Сярод іншага, у маніфесце адзначаецца, што «нацыянальным інтарэсам Беларусі адпавядае хутчэйшае адхіленне ад пасады Аляксандра Лукашэнкі». Разам з тым, небяспека «сыходзіць не толькі ад рэжыму, але і ад найвышэйшых колаў Расіі».

У выпадку прыходу да ўлады кандыдат павінен гарантаваць выхад Беларусі з Мытнага саюза і АДКБ, вывад расійскіх вайсковых базаў з краіны.




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Кандыдат у прэзідэнты ад партыі БНФ Рыгор Кастусёў (справа) катэгарычна супраць уцягвання Масквы ў беларускія справы.**

«Нашы словы аб змаганні на два франты пацвярджаюцца, — кажа Рыгор Кастусёў, кандыдат у прэзідэнты ад Партыі БНФ. — Здымаць Лукашэнку рукамі Масквы — небяспечна. Расія пачала пошук сілаў, на якія магла б абаперціся ў Беларусі. Пазіцыя проста супраць Лукашэнкі слабая, трэба ведаць, за што мы».

На думку Кастусёва, на выбарах будзе два блокі: «псеўдадэмакратычны», блізкі да Крамля, і нацыянал-дэмакратычны.

Першы адказ на маніфест не прымусіў сябе доўга чакаць. Адказаў каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў. Ён рашуча адмовіўся падпісвацца пад прапановай БНФ.

«Ні адзін разважны палітык Беларусі не падпіша выпушчаны цяперашнім кіраўніцтвам БНФ маніфест. Недарэчнасць гэтага дакумента настолькі відавочная, што прымушае задумацца пра сапраўдныя мэты яго ініцыятараў. Чаму ён з'явіўся менавіта цяпер, калі пазіцыя Расеі ў стаўленні да апошняй дыктатуры Еўропы пачынае мяняцца? Адказ напрошваецца адзін: спалохам, што ў Беларусі сапраўды нешта можа памяняцца і імкненнем гэтаму перашкодзіць.

Нядаўняя наша гісторыя вучыць, і давайце шчыра пра гэта казаць, што змены ў Беларусі адбываліся пасля імпульсаў з Масквы. Што дрэннага ў тым, што сёння менавіта Масква зноў прыцягвае ўвагу да расследавання справаў зніклых, гаворыць пра карумпаванасць дыктатара Лукашэнкі і яго атачэння? У гэтых умовах спроба кіраўнікоў БНФ прадставіць апазіцыю сляпой і глухой не вытрымлівае ніякай крытыкі.

Сёння з'явіўся рэальны шанец пазбавіць краіну ад дыктатуры, і мы ім абавязкова скарыстаемся. На жаль, кіраўніцтва БНФ не хоча ў гэтым удзельнічаць», — заявіў Андрэй Саннікаў.

Старшыня БНФ Аляксей Янукевіч адрэагаваў на гэтыя словы Саннікава.

«Спадар Саннікаў прыняў на свой рахунак перасцярогі ад удзелу ў крамлёўскіх сцэнарах, што ўтрымліваюцца ў нашым маніфесце. Тут ён выдаў сябе з галавой. Ягоны тэзіс, што дэмакратычныя імпульсы да нас заўсёды ішлі з Масквы, цалкам не адпавядае рэчаіснасці. Няхай ён запытае ў грузінаў ці ўкраінцаў, якія імпульсы з Масквы дайшлі да іх апошнім часам. А калі спадар Саннікаў не гатовы падпісацца за развіццё беларускай мовы і культуры, за вывад расійскіх базаў з Беларусі, за недапушчэнне карупцыйнай прыватызацыі (пра ўсё гэта сказана ў Маніфесце), то якіх пераменаў ён хоча?» — рытарычна пытаецца Янукевіч.

Рэакцыі Някляева, Мілінкевіча, Раманчука, Рымашэўскага на маніфест пакуль няма.

**Зміцер Панкавец**

## Сцісла

• **Фіны выкупілі акцыі ААТ «Лідскае піва».** У выніку выкупу акцый у фізічных асоб фінскі канцэрн Olvi стаў уладальнікам больш як 90% акцый у ААТ «Лідскае піва». Цана выкупу была 675 тысяч рублёў за акцыю. У канцы 2008 года фінскі канцэрн набыў кантрольны пакет акцый лідскага прадпрыемства за $16 млн. У 2009-м інвестар павялічыў сваю долю ў «Лідскім піве» з 51 да 87,85% шляхам выкупу акцый у фізічных асоб. Летась фінскі інвестар выкупляў акцыі па 616 тысяч рублёў за штуку.

• **Гадуем беларусаў і ў сярэдніх школах.** Пабачыла свет другая частка мультымедыйнага метадычнага дапаможніка «Гадуем беларусаў: Для сярэдняй школы». Ініцыятарам праекта выступіла каманда інфармацыйна-метадычнага сайта Nastaunik.info. Дыскі прызначаны для некамерцыйнага карыстання: каб атрымаць «Гадуем беларусаў», любому адукатару ці адукацыйнай установе дастаткова звярнуцца на адрас info@nastaunik.info. Больш інфармацыі — **старонка 5**.

• **Мытня затрымала тры тоны анаболікаў.** Брэсцкія мытнікі знайшлі неафармленыя спартовыя прэпараты пры надглядзе аўтацягніка, які накіроўваўся з Нямеччыны ў Казахстан. Кошт грузу, які перамяшчаўся цераз мяжу з парушэннем заканадаўства, склаў каля 400 мільёнаў рублёў.

• **«Ліверпуль» адмовіўся купляць Глеба.** Англійскі клуб адмовіўся прыняць Аляксандра Глеба і 23 мільёны еўра ў абмен на аргенцінскага абаронцу Хаўера Маскерану. «Ліверпуль» хоча атрымаць за Маскерану 30 мільёнаў еўра. Англічанам патрэбныя грошы, а не беларускі футбаліст. Маскерана мае намер сысці з «Ліверпуля» і нават адмовіўся выйсці на поле ў матчы чэмпіянату Англіі супраць «Манчэстар Сіці».

• **Януковіч прапануе пашырыць прэзідэнцкія паўнамоцтвы.** Прэзідэнт Украіны падчас урачыстасцяў з нагоды Дня Незалежнасці заклікаў унесці змены ў Канстытуцыю краіны. Ён выступае за наяўнасць «моцнага прэзідэнта, які б меў практычныя рычагі». Папярэднія папраўкі ў Канстытуцыю Украіны былі ўнесеныя ў часе Аранжавай рэвалюцыі. Тады кучмісты і януковічаўцы пагадзіліся здаць уладу ўзамен за абмежаванне паўнамоцтваў прэзідэнта. Так яны захавалі кантроль над эканомікай праз парламент.

**СМ**

## Самае чытанае на nn.by за 18—24 жніўня

- У праграме НТВ стаіць інтэрв'ю з «Аляксандрам Казуліным, кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь»
- Фотафакт. Лукашэнка на саміце ў Ерэване, нібы асуджаны
- Лецішчы пад бел–чырвона–белымі сцягамі
- Зімоўскі: «Ад Лукашэнкі чакаюць хаджэння ў Каносу»
- Сэкс у Вялікім Княстве
- Фантазмы на Лідчыне: «Лукашэнку заб'юць на Дажынках»
- На пасяджэнне кандыдатаў ад апазіцыі не з'явіўся ні адзін кандыдат
- Падтрымайма прэзідэнта
- Сяргей Панамароў папрасіў прытулку ў Польшчы
- А вада там блакітная

## nn@nn.by

### А вада там блакітная (№31)

На Любаншчыне таксама крэйдавыя кар'еры ёсць. На паўдарозе між Салігорскам ды Любанню. З блакітнай вадою. Тут яшчэ і краявіды выдатныя! Можа, шаноўны карэспандэнт і сюды завітае? Запрашаю ўсіх!

**Любанчанка**

## АД РЭДАКТАРА

Унутры рэдакцыйнага кола былі спрэчкі, ці варта публікаваць у газеце гутарку з Яраславам Раманчуком «без палітыкі», на пабытовыя, лёгкія тэмы.

Быў аргумент супраць: мы трапляем у сеткі гламуру, калі ўсё зводзіцца да моды, сэксу, спорту, ежы; істотнае падмяняецца неістотным, палітычнае – непалітычным, цяжкае — лёгкім; пытанні маралі адпадаюць.

Быў аргумент за: гутарка добра чытаецца, і людзям цікава, як, чым жывуць палітыкі па-за палітыкай.

Вырашылі: публікаваць. Пераважыў вось які аргумент. У постсавецкіх краінах дамінуе стыль палітыка-небажыхара. Такі існуе па сваіх, аднаму сабе пісаных законах, яму наканавана кіраваць іншымі людзьмі, прычым пажыццёва ці, прынамсі, пакуль іншы такі самы яго не скалупне. Ён ездзіць на вялікіх, дарагіх браняваных машынах, яго суправаджае ахова. Ён акцёр вялікай сцэны.

Раманчук выразна належыць да палітыкаў іншага стылю, назавём яго скандынаўскім. Такі палітык нічым не розніцца ад звычайнага, сярэдняга грамадзяніна. Ён падкрэслена жыве тым жа жыццём, па тых жа законах. Нават калі яго абяруць у высокі кабінет, такі палітык будзе з яго вяртацца ў сваю двухпакаёўку. Гэтак прэзідэнт Фінляндыі часам ездзіць на працу роварам. Палітык як адзін з нас.

У той жа час Раманчук не разыгрывае з сябе дысідэнта.

Гутарка з Яраславам Раманчуком цікавая ў тым ліку гэтым перакульваннем стэрэатыпаў — **старонка 12**.

# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Сяргею С. з Любанскага раёна.
Віктару С. з Лепельскага раёна.
Валеру С., А.Г. з Віцебска.
Вользе Ж., В.Д. з Барысаўскага раёна.
Н.Х., В.П., Васілю Б. са Шчучына.
Аляксею П., І.Х. з Гродна.
Андрэю М. з Чашніцкага раёна.
Віктару З., Георгію Г., Уладзіміру М., Пятру Б., Тамары Ф. з Брэста.

# Дамова калектыўнага ігнаравання

Працяг са старонкі 1.

Што ж Лукашэнка хацеў пачуць ад былога прэзідэнта? Можа хацеў даведацца, як адчувае сябе экс-кіраўнік пасля адстаўкі. А можа хацеў, каб Качаран стаў пасярэднікам у адносінах з Расіяй.

Як вынікае з паведамленняў дзяржаўных СМІ, Лукашэнка ў Арменіі сумяшчаў карыснае з прыемным.

На наступны дзень пасля палітычных дэбатаў ён праехаўся па Ерэване ў кампаніі найбагацейшага чалавека Арменіі Гагіка Цуракяна. Сярод іншага, яны наведалі каньячны завод. У гонар Мікалая Лукашэнкі была закладзеная 400-літровая бочка каньяку, якую запавялі адчыніць толькі ў дзень вяселля хлопчыка.

Дарэчы, у афіцыйных паведамленнях так і не адзначалася калі Лукашэнка вярнуўся з Арменіі ў Беларусь. На тэлеканалах ён з'явіўся толькі ў аўторак.

### На здымках бачна ўсё

Што ўласна да саміта, то ніякага пацяплення ў стасунках Лукашэнкі і Мядзведзева не было. Нават па тых фотаздымках, што былі зробленыя на сустрэчах, было бачна, што беларускі лідэр трымаўся адасоблена ад іншых прэзідэнтаў.

Ніхто паразмаўляць з Лукашэнкам так і не захацеў. Чаму так адбылося? Ёсць меркаванне, што такую манеру паводзінаў з Лукашэнкам прапанавала расійскае кіраўніцтва. Іншыя ж прэзідэнты вымушаны былі згадзіцца.

Часопіс «Русский Newsweek» мяркуе, што ў прыватнай размове з Назарбаевым Лукашэнка абразіў Мядзведзева. Прэзідэнт Казахстана наскардзіўся на гэта расійскаму калегу. «Цяпер будзем з ім, як з Ючшанкам», — нібыта адказаў на гэта Мядзведзеў.

**Ёсць меркаванне, што такую манеру паводзінаў прапанавала расійскае кіраўніцтва.**

Звярнула ўвагу, што ні да, ні падчас, ні пасля саміта Лукашэнка, звычайна гаваркі, не зрабіў ніводнай заявы.

Што да вынікаў саміта, то галоўны заключаецца ў тым, што расійскія вайскоўцы застануцца ў армянскім Гюмры. За гэта Расія паабяцала браць удзел на баку Арменіі ў любым ваенным канфлікце.

Ну а Беларусь паабяцала пераняць старшынёўства ў АДКБ у снежні.

### Перспектыва ў ГУАМ

Гледзячы на гэтае пагаршэнне адносін Лукашэнкі з краінамі АДКБ, яшчэ больш праўдзівымі падаюцца чуткі пра запрашэнне Беларусі ў ГУАМ.

Мяркуйце самі. Азербайджан выдзеліў нашай краіне крэдыт, каб разлічыцца з даўгамі за газ. Прэзідэнт Грузіі выгароджваў беларускага кіраўніка пасля інфармацыйнай атакі Масквы. Адносіны з Украінай пачалі наладжвацца яшчэ пры Ючшанку, наўрад яны




зноў сапсуюцца пры Януковічу.

Дарэчы, інтрыгоўны факт, што бліжэйшым часам Мінск наведае выконваючы абавязкі прэзідэнта Малдовы Міхай Гімпу. Наўрад ці ён прывязе Лукашэнку фармальнае запрашэнне далучыцца да арганізацыі, якую ў Крамлі лічаць антырасійскай. Тая арганізацыя даўно не збіралася. Яна ўяўляе сабой хутчэй нефармальны ланцуг краінаў, якія ставяць мэтай інтэграцыю ў Еўрасаюз, а не з Расіяй.

**Зміцер Панкавец**

# Ротны коннай паліцыі Вільні ў беларускай турме



Літоўскі паліцыянт быў жанаты з беларускай.

**Лайманас Банкаўскас быў затрыманы на літоўска–беларускай мяжы пры спробе перавесці з сабой наркатычныя рэчывы.**

Ротны камандзір муніцыпальнай коннай паліцыі Вільні Лайманас Банкаўскас быў затрыманы на мытні. У яго машыне знайшлі 45 грамаў амфетаміну. Літоўскія эксперты адразу заўважылі, што як для ўласнага выкарыстання — гэта вельмі шмат, а для продажу — мала.

У Банкаўскаса беларуская жонка, ён часта наведваў нашу краіну. У Мінску жыве цешча паліцэйскага. Гэтым разам ён ехаў у Беларусь, каб заправіцца танным палівам для паездкі на мора.

Ёсць меркаванне, што арышт Банкаўскаса звязаны з тым, што ён адмаўляўся ад вярбоўкі беларускімі спецслужбамі, за што потым яму і адпомсцілі. У Літве ўсе перакананыя, што наркотыкі паліцэйскаму падкінулі, але матывы застаюцца няяснымі.

Справа перададзеная пад кантроль КДБ, літовец змешчаны ў ашмянскі ізалятар пакуль на 10 сутак.

Выказалася па гэтым інцыдэнце і прэзідэнцкая прэс-служба Літвы. У канцылярыі Далі Грыбаўскайце спадзяюцца на хутчэйшае вызваленне Банкаўскаса.

Паводле артыкула 228 КК «Кантрабанда наркотыкаў», літоўцу пагражае ад 3 да 7 гадоў зняволення.

Спецслужбы Беларусі і Літвы вялі ў мінулым актыўную барацьбу. З ёй звязвалі, у прыватнасці, гібель у Брэсце літоўскага дыпламата Вітаўтаса Пацюнаса. Ён загадкава выпаў з вузенькага акна гатэля «Інтурыст». У Вільні ж быў арыштаваны беларускі разведчык, якога пасля выдалі Польшчы.

**ЗП**

# Казулін на НТВ нічога асаблівага не сказаў

**У нядзелю папулярны расійскі тэлеканал паказаў інтэрв'ю з былым кандыдатам на пасаду прэзідэнта Аляксандрам Казуліным.**

Паўгадзінная размова выйшла ў рамках серыі «Без купюр». Вядучы Раман Собаль адразу зазначыў, што размова адбываецца «дзесьці ў Еўропе».

Увогуле, якія ўражанні засталіся ад прагляду гэтага інтэрв'ю? Падалося, што гэта разгорнуты каментар да «Хроснага бацькі». Казулін гаварыў пра тое самае: карупцыя ў верхніх эшалонах улады, зніклыя палітыкі, арышты апазіцыянераў.

Нічога новага ці істотнага Казулін не сказаў. Не было заяваў, што Казулін зноў гатовы ісці на прэзідэнцкія выбары.

Для чаго НТВ паказвае ў прайм-тайм гутарку з малавядомым у Расіі палітыкам? Выглядае на тое, што разлічана гэта найперш на гледача беларускага, якому пасля «Хроснага бацькі» даюць чарговы раз зразумець, што Крэмль на выбарах Лукашэнку не падтрымае.

А праз гэтыя інтэрв'ю Масква намёкам акрэслівае, хто з беларускіх палітыкаў яе задавальняў бы.

**ЗП**

# Міхаіл Казлоў на волі

**Былы міліцыянт праходзіў па адной справе з Аўтуховічам.**

Яшчэ два тыдні таму з віцебскай калоніі «Віцьба» выйшаў на волю былы міліцыянт Міхаіл Казлоў. Ён праходзіў па адной крымінальнай справе разам з ваўкавыскімі прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам і Уладзімірам Асіпенкам.

Падпалкоўнік Казлоў добра знаўся з Аўтуховічам і Асіпенкам. У Гродзенскай міліцыі ён займаўся расследаваннем карупцыйных справаў. У тым ліку сярод ваўкавыскіх чыноўнікаў.

У свой час Казлоў завёў крымінальную справу на намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко, таго самага, на якога нібыта рыхтаваў замах Аўтуховіч. Але пры дапамозе Шэймана тую справу ўдалося замяць.

Пасля першага арышту Аўтуховіча Міхаіл Казлоў часта сустракаўся з Уладзімірам Асіпенкам, папярэджваў, што супраць яго можа быць ужытая якаясьці правакацыя.

Следства абвінавачвала Казлова, што ён ведаў пра «падрыхтоўку замаху» на гродзенскага начальніка Саўчанку, але не папярэдзіў. Потым высветлілася, што замаху не было, але Казлова ўсё адно асудзілі за невыкананне службовых абавязкаў.

Казлова прыгаварылі да двух гадоў, але паводле амністыі скарацілі тэрмін да года. Уладзімір Асіпенка і Мікалай Аўтуховіч працягваюць знаходзіцца ў Івацэвіцкай калоніі.

**ЗП**

## Сцісла

• **У Мінск прыбыў новы пасол ФРГ Крыстаф Вайль.** Да гэтага дыпламат працаваў у Расіі, Бразіліі, Іраку, пры НАТА і еўраструктурах бяспекі. Кажуць, апошні факт выклікаў незадавальненне беларускіх уладаў.

• **Лукашэнку запрасілі ў Трускавец.** Прэзідэнты Беларусі, Венгрыі, Малдовы, Польшчы, Румыніі, Славакіі і Украіны запрошаны на X Міжнародны эканамічны форум «Трансгранічнае супрацоўніцтва. Погляд у будучыню», які 7—8 кастрычніка пройдзе ў Трускаўцы (Львоўская вобласць Украіны).

• **Жыхар Клецка Сяргей Панамароў папрасіў прытулку ў Польшчы.** У Беларусі супраць яго была заведзеная крымінальная справа паводле арт. 369 КК РБ («Знявага прадстаўніка ўлады»). Да суда Панамароў мусіў знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Сам Панамароў тлумачыць ад'езд тым, што да яго дайшла інфармацыя, нібыта ў Клецкім РАУСе супрацоўнік КДБ казаў, што з «Панамаровым трэба канчаць».

**ЗП, СП**

# Венесуэльскай нафты замала для запаўнення «Адэсы—Бродаў»

Украіна выстаўляе Лукашэнку жорсткія ўмовы.




Украіна гатовая даць Беларусі магчымасць пастаўляць венесуэльскую нафту трубаправодам Адэса—Броды, але толькі ў выпадку гарантыі, што гэтым маршрутам будзе прапампоўвацца, прынамсі, 9 мільёнаў тон штогод. Пра гэта заявіў міністр транспарту Украіны Канстанцін Яфіменка.

Толькі на такіх умовах Кіеў гатовы развярнуць кірунак пампавання па трубаправодзе ў бок Беларусі. Пампаваць меншыя аб'ёмы нафты эканамічна немэтазгодна. Цяпер гэтым маршрутам у Адэсу транспартуецца расейская нафта.

Паводле словаў урадоўца, калі Мінск такой гарантыі не дасць, то нафта з Венесуэлы і надалей будзе дастаўляцца на Мазырскі НПЗ чыгункай. Але 9 мільёнаў тон — невыканальны паказчык.

Паводле дамоўленасцяў Аляксандра Лукашэнкі і Уга Чавеса, Мінск плануе закупіць у Каракаса 4 мільёны тон нафты ў 2010 годзе і 10 мільёнаў тон — у 2011 годзе. Адпак частка нафты мае трапляць на наваполацкі «Нафтан» праз тэрміналы ў эстонскай Муузе і літоўскай Клайпедзе.

Нават у 2011 годзе прапампоўка 9 мільёнаў тон праз Адэсу не мае эканамічнага сэнсу. Папершае, няма патрэбы адмаўляцца цалкам ад таннейшай, хоць і горшай па якасці расейскай нафты. Па-другое, агульная максімальная патрэба Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода складае каля 12 мільёнаў тон. Але сёлета аб'ёмы перапрацоўкі прыкладна на 30% ніжэйшыя. Да таго ж, каля 1,8 мільёна тон на завод трапляе з беларускіх палескіх радовішчаў.

Тэарэтычна нафта можа пацячы нафтаправодам Адэса—Броды ў 2011 годзе, але толькі ў выпадку, калі Беларусь цалкам адмовіцца ад закупу расейскай сыравіны або Расея адмовіцца прадаваць нафту Беларусі. І той, і той варыянт нерэальныя.

Пагадненне пра захады ў развіцці супрацы па транспартаванні нафты праз Украіну ў Беларусь было падпісанае 12 ліпеня гэтага года віцэ-прэм'ерамі дзвюх краінаў. Яно дало падставы меркаваць, што ад 2011 года можа пачацца выкарыстанне нафтаправода Адэса—Броды для пампавання гэтых аб'ёмаў.

Вынікае, што выкарыстанне «Адэсы—Бродаў» у аверсным рэжыме стане магчымым, толькі калі з'явіцца працяг нафтаправода ў Польшчу і вольная нафта з каспійскага басейна для яго напаўнення. Канкрэтных прапановаў ад нафтавых кампаній наконт гэтага пакуль не было.

Першы танкер з Венесуэлы прыбыў у Адэсу 25 красавіка, другі — 19 чэрвеня, трэці — 29 чэрвеня, чацвёрты — 19 ліпеня.

Міністр транспарту Украіны адзначыў, што задэкларaваных Беларуссю аб'ёмаў паставак венесуэльскай нафты дасягнута не будзе. Замест агучаных 4 мільёнаў тон, мяркуе ён, пастаўлена будзе ўсяго каля 1 мільёна.

У порт прыходзіць прыкладна два танкеры ў месяц, гэта значыць каля 160 тысяч тон за месяц. У сувязі з гэтым міністр адзначыў, што Украіна не будзе надаваць зніжак за транспартаванне — маўляў, аб'ёмы недастатковыя. Міністр мяркуе, што балтыйскія парты канкурэнцыі ўкраінскаму маршруту ўсё адно не складуць.

Нягледзячы на мінімальныя аб'ёмы паставак, варта адзначыць, што пастаўкі нафты з Венесуэлы ўпершыню дыверсіфікавалі крыніцы энерганосьбітаў для Беларусі. Да апошняга часу Беларусь заставалася краінай, якая татальна залежыць ад паставак вуглевадародаў з Расіі. Паводле стандартаў ЕС, краіна не павінна атрымліваць ад аднаго пастаўшчыка больш за трацiну аб'ёму спажываных энерганосьбітаў.

**Сяргей Гезгала**

# Латыпаў накупляў нерухомасці на мільён даляраў



Былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі някепска зарабляе ў Маскве.

Невядома, колькі складаюць аклад і бонусы былога міністра ўнутраных спраў Беларусі Уладзіміра Навумава на сённяшняй яго пасадзе памочніка кіраўніка дзяржкарпарацыі «Растэхналогіі». Але, мяркуючы па ўсім, іх памер не павінен моцна саступаць заробкам былога кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Урала Латыпава, які набыў сыну і дачцэ маскоўскія кватэры агульным коштам каля $1 мільёна.

Як сведчыць гадавая справаздача ААТ «Маскоўскі тэлевізійны завод «Рубін» за 2009, у мінулым годзе гэтае прадпрыемства ажыццявіла ўгоды па продажы двух кватэр і прыкладзеных да іх машынамесцаў дзецям Урала Латыпава (Алене і Кіму) на агульную суму $930 тысяч. Кватэры размешчаныя ў адным доме ў непасрэдным суседстве адна з адной.

Нагадаем, што Урал Латыпаў найцяснейшым чынам звязаны з ААТ «МТЗ «Рубін». З 2009 былы найбліжэйшы паплечнік Аляксандра Лукашэнкі ўзначальвае кіроўную структуру гэтага буйнога маскоўскага дэвелаперскабудаўнічага холдынга — кампанію «Дырэкт-Менеджмент».

У кіраванні Латыпава знаходзіцца будаўнічы бізнэс групы (кампанія «Созидание»), яе буйныя дэвелаперскія праекты (ТВЦ «Горбушкин двор», ТРЦ «Филион», дзелавы цэнтр «Рубін», складская база «Сетунь»). У партфоліа «МТЗ «Рубін» — таксама праект будаўніцтва гатэльнадзелавога цэнтра агульнай плошчай 137 тыс. кв.м каля Парку Перамогі.

Кампанія ўваходзіць у лік лідэраў расійскага рынку забудовы і эксплуатацыі гандлёвых і офісных памяшканняў.

Сярод уладальнікаў холдынга Урал Латыпаў не значыцца. Але адным з галоўных акцыянераў гэтай групы называецца цяперашні дэпутат Масгардумы, ураджэнец Мінска Аляксандр Міляўскі.

Таксама долю ў ААТ «МТЗ «Рубін» мае кіпрская структура Timeturns Holdings Ltd., якой у Беларусі належаць буйныя долі ў ААТ «Амкадор» і ў дэвелаперскай кампаніі «БНК Холдынг» (Rubin Plaza, Silver Tower і інш.).

**Ej.by**

# Дзяржкантроль дапаможа павялічыць сярэдні заробак

Арганізацыя праверыць прадпрыемствы, якія выплачваюць працаўнікам менш за $200.

Камітэту дзяржаўнага кантролю даручана з 23 жніўня па 23 верасня ўшчыльную заняцца пошукам і спыненнем выплат зарплаты «ў канвертах». Асноўная задача — высветліць прычыны, па якіх асобныя наймальнікі выплачваюць работнікам заробак у памеры, ніжэйшым за $200 у эквіваленце.

Па падліках арганізацыі, такіх прадпрыемстваў у рэспубліцы больш за 30 тысяч. Яны аўтаматычна трапляюць у спіс падазроных, бо праз іх недаплаты сярэдні заробак у краіне не можа дасягнуць $500.

Дзяржкантроль прапануе працаўнікам «здаваць» сваіх кіраўнікоў. Вітаюцца як званкі на гарачую лінію, так і электронныя лісты.

**Яўген Васількоў**

## Сцісла

• **«Мінскхлебпрам» будзе пастаўляць у Ізраіль замарожаны хлеб.** Праект па вытворчасці замарожанага хлеба планавалася рэалізаваць яшчэ некалькі месяцаў таму, аднак праз анамальную спёку тэрміны перанеслі на верасень. Для атрымання замарожанага хлеба яго выпякаюць да 95% гатоўнасці, а затым замарожваюць пры тэмпературы да мінус 30°C. Пасля гэтага хлеб можа захоўвацца пры мінус 18°C на працягу трох месяцаў. «Мінскхлебпрам» мае намер набыць абсталяванне для вытворчасці замарожаных тартоў, у закупцы якіх зацікаўлены кавярні і рэстараны.

• **За паўгода заробкі беларусаў выраслі на 28%?** Па падліках Белстата, сярэдні заробак у ліпені дасягнуў 1,282 мільёна рублёў. У студзені ж заробак складаў роўна мільён рублёў. Каб дайсці ў статыстычных справаздачах да адзнакі $500, заробак павінен павялічвацца такімі ж тэмпамі да канца года.

• **Электраэнергія і цяпло для юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў падаражалі на 21% з 20 жніўня.** Прычына — «стабілізацыя разлікаў за прыродны газ».

• **У Беларусі будзе наладжаны выпуск армянскіх каньякоў.** Такая дамоўленасць дасягнута 21 жніўня ў час наведвання Аляксандрам Лукашэнкам Ерэванскага завода па вытворчасці каньячнай прадукцыі. Дарэчы, перад тым Ерэванскі завод падарыў 400-літровую бочку каньяку... малодшаму сыну Лукашэнкі Колю. Таблічка каля бочкі абвяшчае: «Адкрыць у дзень вяселля Мікалая Аляксандравіча Лукашэнкі». «Калі б такі падарунак зрабілі дзяржаўнаму чыноўніку, то ён быў бы абавязаны перадаць яго дзяржаве, бо 400 літраў каньяку — гэта хабар у асабліва буйным памеры, — адзначае ў сваім блогу журналістка Святлана Калінкіна. — Але падарунак зроблены дзіцяці — Коля Лукашэнка толькі сёлета ідзе ў першы клас».

• **Беларуская бульба ўратуе Расію.** Краіна атрымала тэрміновую замову на пастаўку 40 тысяч тон бульбы. Гэта звыш таго, што раней планавалася ў сезон 2010–2011 экспартаваць яшчэ не менш за 50 тысяч тон бульбы. Неўраджай у Расіі супаў з ураджаем у Беларусі.

**ЯВ**

# Нью-Ёрк, дыскутаваць і васямнаццаць

**З 1 верасня ўступаюць у сілу новыя правілы школьнай арфаграфіі і пунктуацыі.**

Што мяняецца? Зменаў нямала, але яны ахопліваюць малую частку лексічнага запасу.

### Аканне на канцы запазычанняў

Пашыраецца прынцып перадачы акання пры напісанні запазычаных слоў: *трыа*, *Ватэрлоа*.

### Яканне ў лічэбніках

Паводле агульнага правіла перадачы на пісьме якання ў першым пераднаціскным складзе прапанавана пісаць *дзявяты*, *васямнаццаць*.

### Ў у запазычаннях

У большасці іншамоўных слоў ужываецца «ў»: *ва ўніверсітэце*, *для ўніята*, але: *траур*.

### Абрэвіятуры

Скарочаныя часткі абрэвіятур пішуцца так, як у адпаведных поўных словах: *галоўурач* (галоўны), *інтэрпал* (інтэрнацыянальная паліцыя), *лінкар* (лінейны карабель).

### Спрэчны прэзідэнт

Вялікае абмеркаванне выклікала напісанне слова «прэзідэнт». Згодна з новымі правіламі, з вялікай літары трэба пісаць словы або спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца афіцыйнымі назвамі асобы на вышэйшых дзяржаўных і рэлігійных пасадах: *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*, *Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі*, а ў неафіцыйным ужыванні з малой літары: *візіт прэзідэнта*, *выступленне старшыні*; але: *выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*. Дзяржаўная прэса ўжо некалькі гадоў кіруецца такім правілам.

### Ё

З 1 верасня таксама будзем пісаць *Нью-Ёрк* (замест Нью-Йорк), *ёркшырскі* (йоркшырскі), *дыскутаваць* (дыскутыраваць).

### Што з класічным правапісам?

Што ж стане з класічным правапісам, які піша «сьнег», «газэта»?

Дырэктар Інстытута мовазнаўства Аляксандр Лукашанец адзначыў, што да тарашкевіцы трэба ставіцца з павагай і «абсалютна нармальна, калі будуць з'яўляцца факсімільныя выданні, перавыданні твораў беларускіх пісьменнікаў і навуковыя творы, напісаныя гэтым правапісам». Але цяпер афіцыйна зарэгістраваныя беларускамоўныя выданні павінны перайсці на новыя правілы.

Да новаўвядзення Міністэрства адукацыі пачало рыхтавацца яшчэ ў 2008 годзе. Тады асобным выданнем з'явіліся новыя «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Згодна з новымі правіламі выйшлі «Беларускі арфаграфічны слоўнік» і «Сучасны руска-беларускі слоўнік для школьнікаў». А вось перавыданне беларускамоўных падручнікаў яшчэ не завяршылі. Зрабіць гэта мяркуюць у бліжэйшыя два-тры гады. Настаўніца беларускай мовы Зоя сказала, што ў іх школе яшчэ няма кніг па літаратуры для 8 класаў і па мове для 9 класаў.

«Таксама мы павінны на ўроках тлумачыць змены. У пачатку кожнага ўрока трэба праводзіць арфаграфічную хвілінку. І ў кожным кабінеце мусяць вісець стэнды з рубрыкай «Пішам правільна». Ці прывядуць змены да таго, што школьнікі пачнуць рабіць менш памылак? Зоя не ўпэўненая. «А ці абгрунтаваныя былі тыя змены ўвогуле, пабачым праз 2-3 гады».

Міністэрства адукацыі прадугледжана пераходны перыяд для ўвядзення новай рэдакцыі правіл у школьнае навучанне. Гэты тэрмін складае тры гады. Пакуль пры ацэнцы ведаў школьнікаў не будуць улічвацца выпадкі, звязаныя са зменамі. На працягу ўсяго перыяду і ў заданнях цэнтралізаванага тэставання не будуць выкарыстоўваць новаўвядзенні.

**Сяргей Макарэвіч**

**«ARCHE» пераходзіць не збіраецца**

Часопіс «ARCHE» — адзінае такое выданне, што выкарыстоўвае класічны правапіс. Рэдактар Валерый Булгакаў кажа, што на новыя правілы ад 1 верасня пераходзіць не збіраецца. «Пяройдзем толькі тады, калі лукашэнкаўская дзяржава пачне караць за класічны правапіс і паставіць пытанне аб дэлегалізацыі часопіса. Мы ўспрымаем гэты закон як форму палітычнага ціску. Ён найперш нацэлены супраць незалежных СМІ і выдавецтваў».

Выдавецтва Ігара Логвінава — найбуйнейшае па выпуску кніг класічным правапісам. «Тыя кнігі, што ў планах, — будзем выдаваць, а пра наступныя будзем думаць», — адзначае Ігар.

## Школа задыхаецца ў паперавытворчасці

адзначыў намеснік міністра адукацыі.

У сістэме адукацыі неабходна спыніць паператворчасць. Аб гэтым заявіў сёння на Мінскай абласной канферэнцыі педагагічных работнікаў у Салігорску намеснік міністра адукацыі Беларусі Казімір Фарыно.

Паводле слоў намесніка міністра, аналіз паказвае, што педагогам часта замест таго, каб займацца навучаннем і выхаваннем дзяцей, даводзіцца пісаць розныя паперы. «Выходзіць: план на плане і планам паганяе, і ў выніку ў сістэме адукацыі зверху ўніз і знізу ўверх ходзіць вялікая колькасць папер. Такога быць не павінна», — падкрэсліў Казімір Фарыно, звяртаючыся да намеснікаў старшынь райвыканкамаў, якія курыруюць сацыяльную сферу.

Міністэрства адукацыі падрыхтавала ўжо адпаведныя метадычныя рэкамендацыі, у якіх прапісана, што павінна быць у гадавым плане.

Таксама намеснік міністра спыніўся на пяці асноўных прынцыпах, на якіх у далейшым павінна будавацца работа сістэмы адукацыі. Гэта забеспячэнне якасці, сацыяльная арыентацыя, сістэмнасць і комплекснасць, фундаментальнасць і эфектыўнасць адукацыі.

З 1 верасня ў школах уводзіцца трэцяя гадзіна замежнай мовы, паведаміў Казімір Фарыно.

**Паводле БЕЛТА**

## У Гродне можа з'явіцца беларускамоўны клас

**Да 1 верасня пройдуць сумесныя з ТБМ і аддзелам адукацыі бацькоўскія сходы.**

Да канца жніўня гэтага года прадстаўнікі гродзенскай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы сумесна з гарадскім аддзелам адукацыі зладзяць шэраг бацькоўскіх сходаў. На іх і вырашыцца пытанне, ці будзе сёлета створаны ў Гродне беларускамоўны клас. На сёння пададзеная толькі адна заява, паведамілі ў гарадскім аддзеле адукацыі.

Па стане на 2009 г. у Гродне і гарадах вобласці дзейнічала 5 беларускамоўных школаў. Між тым, да 1995 года адукацыя была пераважна беларускамоўнай.

**СП**




**Надзвычай шырокі асартымент маюць сталічныя гандлёвыя кропкі.**

## Беларускамоўныя школы сталіцы

Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

Акрамя васьмі беларускамоўных гімназій і школ, сем школ Мінска набіраюць асобныя беларускамоўныя класы. Старшыня Таварыства беларускай школы Алесь Лозка нагадвае, што бацькі першакласнікаў маюць канстытуцыйнае права падаваць заяву на навучанне па-беларуску ў любую школу.

**Гімназія №4 (вул. Кунцаўшчына, 18)** прапануе навучанне ў фізіка-матэматычных, хіміка-біялагічных і філалагічных класах.

Даведка: e-mail: gymn4.minsk.edu.by, т.: (017) 258-49-71, 258-49-74.

***

**Гімназія №23 (пр. Незалежнасці, 45)** прапануе вывучэнне прадметаў па-беларуску, а таксама выкладанне на высокім узроўні англійскай, кітайскай, польскай моваў.

Даведка: e-mail: gymn23@minsk.edu.by; т.: (017) 284-47-62, 284-87-16.

***

**Гімназія №9 (вул.Сядых, 10)** — вывучэнне ўсіх прадметаў па-беларуску, паглыбленае вывучэнне англійскай мовы, факультатыўнае — польскай. Прапануе вывучэнне прадметаў музычнага цыкла.

Даведка: т.: (017) 283-04-21, 281-38-04.

***

**Гімназія №28 (пр.Ракасоўскага, 93)** прапануе выкладанне ўсіх прадметаў на роднай мове, а таксама паглыбленае вывучэнне французскай мовы, міжнародныя абмены, выкладанне прадметаў на французскай мове (краіназнаўства, літаратура Францыі) па праграмах, распрацаваных настаўнікамі школы.

Даведка: e-mail: sch2@minsk.edu.by.; т.: (017) 248-32-02, 248-12-64.

***

**Гімназія №14 (вул. Васняцова, 10)** прапануе паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсаў па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы і шмат іншага. На базе гімназіі дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

Даведка: т.: (017) 295-01-33, 295-21-31.

***

**СШ №190 (вул.Нікіфарава, 19)** — выкладанне на беларускай і расійскай мовах. Школа прапануе таксама бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведка: т.: (017) 260-24-90; e-mail: sch190@minsk.edu.by.

***

**Школа №60 (вул.Лібкнехта, 82)** — навучанне з музычным ухілам. У школе дзейнічаюць шматлікія гурткі, клубы, музей, творчыя і грамадскія аб'яднанні.

Даведка: т: (017) 208-69-74, 209-94-49.

***

**СШ №68 (зав. Ахоцкі, 17)** прапануе навучанне па-беларуску. Набор у класы з фальклорна-тэатральным напрамкам.

Даведка: e-mail: sch68@minsk.edu.by; т. (017) 243-76-82.

### Белмоўныя класы ў расейскамоўных школах

**СШ №11 (вул. Асаналіева, 14)** — школа з агульнаэстэтычным ухілам.

Даведка: т.: (017) 277-45-34, 275-59-10.

***

**СШ №72 (вул. Халмагорская, 59)** — сёлета будзе набірацца адзін беларускамоўны першы клас. Дадаткова — вывучэнне англійскай мовы, мастацкі ўхіл.

Даведка: т.: (017) 246-53-71, 246-52-42.

***

**СШ №108 (вул. Уральская, 15)** — спартыўныя гурткі і секцыі, вечаровыя класы.

Даведка: e-mail: sch108@minsk.edu.by, т.: (017) 245-20-41.

***

**СШ №131 (вул. Убарэвіча, 74)** — вывучэнне замежных моў (нямецкай, польскай, французскай, іспанскай, шведскай), харэаграфіі.

Даведка: т.: (017) 340-62-38, 345-14-12.

***

**СШ №180 (вул. Радужная, д.8, корп.3)** — паглыбленае вывучэнне англійскай мовы.

Даведка: т.: (017) 250-10-49.

***

**СШ №209 (вул. Рафіева, 91)** — вывучэнне французскай мовы, вакальныя студыі, спартыўныя секцыі.

Даведка: т. (017) 274-69-71, 256-48-77.

***

**СШ №110 (вул. Брэсцкая, 66)** — дзейнічае праграма «Здароўе».

Даведка: т. (017) 278-58-81, 278-11-12.

Да чытачоў. Дасылайце ў рэдакцыю інфармацыю пра беларускамоўнае навучанне ў вашай вобласці і раёне. Пішыце пра новыя ініцыятывы бацькоў і ўпраўленняў адукацыі.

**Сямён Печанко**

## Запрашаем на выставу-прэзентацыю дыска «Гадуем беларусаў — 2»

Шаноўныя настаўнікі, метадысты, адукатары, школьнікі, бацькі!

Таварыства беларускай школы і інфармацыйна-метадычны сайт «Nastaunik.info» запрашаюць вас на на выставу-прэзентацыю дыска метадычных і дапаможных матэрыялаў «Гадуем беларусаў-2», прымеркаваную да пачатку новага навучальнага года.

Выстава-прэзентацыя адбудзецца 26 жніўня з 17:00 да 19:30 у сядзібе Таварыства беларускай мовы па адрасе г. Мінск, вул Румянцава, 13 (метро «Плошча Перамогі»).

У праграме прэзентацыя зместу дыска, сустрэча з аўтарамі і складальнікамі дыска, салодкія пачастункі.

Усе настаўнікі і адукатары атрымаюць дыскі «Гадуем беларусаў-1» і «Гадуем беларусаў-2» у падарунак.

Дыск «Гадуем беларусаў-2» — гэта складанка метадычных матэрыялаў і аўтарскіх распрацовак беларускіх настаўнікаў. Дыск мае старонкі з песнямі і музыкай для аздаблення школьных святаў, фанаграмамі, караоке, сцэнарыямі школьных мерапрыемстваў, трэнінгамі для школьнікаў, навучальнымі гульнямі і відэаролікамі.

### Сцісла

• **Замежнай мовы ў школах прыбавіцца.** З новага навучальнага года ўводзіцца дадатковая гадзіна замежнай мовы. Таксама на ўроках па замежнай мове класы будуць дзяліцца не на дзве падгрупы, а на тры. Такім чынам Міністэрства адукацыі імкнецца ўзняць узровень ведання моваў. Загад пра тое даў Аляксандр Лукашэнка. Два гады таму ўведзеная ім жа рэформа колькасць гадзінаў на замежныя мовы скарачала.

# Мінскі «Крышталь» не вырабляў гарэлку «Гайдукевіч»

**Пра гэта афіцыйна паведаміў першы намеснік гендырэктара РУП «Мінск Крышталь» Сяргей Машкоў.**

21 жніўня ў Мінску адбыўся з'езд Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Удзельнікі кангрэсу і яго госці атрымалі ў падарунак партрэт лідэра партыі Сяргея Гайдукевіча, а таксама пляшку гарэлкі «Гайдукевіч».

Гарэлка — сапраўдная, вырабленая на «Крышталі» і «нават з акцызнай маркай», нахвальваў пітво Гайдукевіч.

На этыкетцы змешчаная выява палітыка на стылізаваным гербе продкаў Гайдукевіча. Над гербам месціцца надпіс «Беларуская шляхта», пад гербам — «Гонар і годнасць», «Парадак у краіне. Дабрабыт у доме». Накрыўка пляшкі мае фірмовы лагатып мінскага гарэлачнага завода «Крышталь» (адзіны надпіс па-беларуску). На этыкетцы ў самым нізе пазначана: РУП «Минск Кристал» (з адным «л»). Гэтая акалічнасць прыцягвае ўвагу тым, што афіцыйная назва мінскага завода па-расійску пішацца праз два «л».

Па тлумачэнні мы звярнуліся да першага намесніка гендырэктара РУП «Мінск Крышталь» Сяргея Машкова. «Магу адразу афіцыйна заявіць, што да гэтай гарэлкі наш завод не мае ніякага дачынення. Мы не атрымлівалі ад ЛДПБ ніякіх заявак і нічога не выраблялі». Спадар Сяргей дадаў, што не выключае выкарыстання фірмовай пляшкі прадпрыемства. «Гэта ж проста — набыў у краме нашу прадукцыю, зняў нашу этыкетку, наклеіў сваю».

Спадар Машкоў патлумачыў, што адбываецца ў выпадках, калі хтосьці падрабляе іх прадукцыю. «Мы пішам гэтай арганізацыі папярэджанне з патрабаваннем спыніць незаконныя дзеянні і ў выпадку чаго выклікаем у суд». Пра гэты канкрэтны выпадак ён зазначыў: калі факт выкарыстання лагатыпа пацвердзіцца, будуць разбірацца з парушальнікамі.

**Сямён Печанко**




**Сяргей Гайдукевіч прапанаваў увесці з Расіяй адзіную валюту і следам далучыцца да Еўрасаюза.**

УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

# Забойства праз каханне, сямейная мафія і 100 літраў брагі

## Сямейны падрад

Раніцай 13 жніўня дзяжурны перадаў у эфір: групе затрымання Фрунзенскага аддзела аховы тэрмінова выбыць на вул. Прытыцкага, 42. Да прапаршчыка міліцыі Андрэя Самусевіча і старшага сяржанта міліцыі Дзмітрыя Кабылянца, якія прыбылі на месца здарэння, звярнулася жанчына, якая стала ахвярай рабавання. Двое маладых вырвалі ў яе сумку з каштоўнасцямі і ўцяклі.

Атрымаўшы прыкметы рабаўнікоў і кірунак, у якім яны схаваліся, супрацоўнікі міліцыі выклікалі на дапамогу яшчэ адну патрульную групу затрымання ў складзе сяржантаў міліцыі Юрыя Ткачэнкі і Аляксандра Сеўрука і пачалі адпрацоўваць вуліцы ў напрамку, у якім схаваліся злачынцы. Па прыкметах нарадамі аховы былі затрыманыя двое маладых людзей, 1989 і 1994 г.н. (як пазней высветлілася — браты), якія праз некалькі хвілін пасля першага ўдалага рабавання паспрабавалі адабраць сумачку яшчэ ў адной жанчыны на вуліцы.

Цяпер браты, якія наўрад ці спыніліся б на дасягнутым, знаходзяцца пад вартай, чакаючы суда.

Па дадзеным факце Фрунзенскім РУУС распачатая крымінальная справа па ч.2 арт.206 (рабаванне) КК РБ.

## П'янству — не

У рамках рэспубліканскай акцыі «П'янству — не» 12 жніўня супрацоўнікамі Фрунзенскага аддзела аховы і Фрунзенскага РУУС было арганізаванае рэйдавае мерапрыемства, падчас якога міліцыянты для адпрацоўкі аператыўнай інфармацыі выязджалі ў вёску Студзёнка Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Падчас мерапрыемства затрымалі мясцовую жыхарку, што прадавала вырабленыя ёю самагон і віно. Тут жа знайшлі самагонны апарат і брагу. Усяго ў Студзёнцы выявілі каля 100 літраў спіртазмяшчальнай вадкасці.

Па дарозе супрацоўнікі міліцыі зазірнулі ў мясцовую прадуктовую краму. Як высветлілася, не дарэмна. Быў выяўлены шэраг парушэнняў антыалкагольнага заканадаўства: прадавец рэалізоўваў віно без сертыфікатаў якасці, да таго ж пратэрмінаванае.

Цяпер парушальнікам давядзецца выплаціць вялікія штрафы.

## Вярнулі грошы… для выплаты штрафу

Няўмольная статыстыка сведчыць аб тым, што ахвярамі злачынстваў часцей за ўсё становяцца бестурботныя грамадзяне, упэўненыя, што зводкі аб здзейсненых злачынствах ніяк не звязаныя з іх жыццём.

Так здарылася і з адным з грамадзян сталіцы. Атрымаўшы доўгачаканы заробак, ён вырашыў, што гэта добрая нагода расслабіцца. Не разлічыўшы з колькасцю прынятага спіртнога, да вечара ён заснуў на лавачцы. Паставы міліцыянт, які нёс службу недалёка ў аддзяленні банка, заўважыў, як да «стомленага» мужчыны падышлі хлопец з дзяўчынай і выцягнулі ў яго нейкі прадмет. Нарад групы затрымання Фрунзенскага аддзела аховы, які прыбыў на выклік на працягу трох хвілін, неўзабаве па прыкметах затрымаў пару. Гэта аказаліся раней судзімы за крадзеж малады чалавек, які нідзе не працаваў, і дзяўчына, што была ў дэкрэтным адпачынку. Яны скралі ў мужчыны мабільны тэлефон і 250 тыс. рублёў.

Па дадзеным факце Фрунзенскім РУУС распачатая крымінальная справа па ч.2 арт.205 (крадзеж) КК РБ.

Дарэчы, пацярпелы таксама быў прыцягнуты да адказнасці, але толькі адміністрацыйнай — за з'яўленне ў грамадскім месцы ў п'яным выглядзе.

**Капітан міліцыі Сяргей Шатрун**

## Сцісла

• **П'яны кавалер утапіў дзяўчыну ў канале.** Са Сляпянкі ў Мінску дасталі труп 20-гадовай дзяўчыны. Памерлая пазнаёмілася ля аднаго са сталічных рэстаранаў з хлопцамі. Пасядзелі ў рэстаране, вырашылі прадоўжыць свой адпачынак на прыродзе. Падчас п'яных пасядзелак адзін з хлопцаў з кампаніі заснуў, а ў другога ўзнік канфлікт з новай сяброўкай — яны пачалі штурхаць адзін аднаго. У выніку дзяўчына не ўтрымалася на нагах і ўпала ў ваду. Плаваць яна не ўмела, а хлопец праз хмель выцягнуць яе не здолеў.

• **25-гадовы жыхар Кобрына падазраецца ў распаўсюджванні парнаграфічных фільмаў.** Непрацуючы малады чалавек стварыў на адным з польскіх інтэрнэт-аўкцыёнаў сваю старонку, дзе размяшчаў кадры з парнафільмаў, якія прапаноўваў набыць. Атрымліваючы заяўкі, ён адпраўляў замоўцам па пошце дыск з запісам. За кожны такі прадукт ён атрымліваў у сярэднім па 4 польскія злотыя (4 тыс. рублёў). Супраць яго распачалі крымінальную справу на падставе ч. 2 арт. 343 КК (распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў ці прадметаў).

• **Суд Тайланда пагадзіўся экстрадыяваць расійскага гандляра зброяй Віктара Бута ў ЗША.** Там яго абвінавачваюць у гандлі зброяй, і яму пагражае пажыццёвы тэрмін. Цікава, што Бут у свой час жыў у Віцебску. Была інфармацыя, што праз яго прадавалі і беларускую зброю. Бута затрымалі ў сталіцы каралеўства па запыце амерыканскіх спецслужбаў у 2008 па абвінавачанні ў парушэнні эмбарга ААН на пастаўку зброі ў зоны рэгіянальных канфліктаў у Афрыцы. Таксама, лічаць амерыканскія пракуроры, Бут прадаваў зброю калумбійскім тэрарыстам («Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі») і «спрыяў тэрарызму». Амерыканцы ўзялі расійца на гарачым: ён быў арыштаваны ў ходзе спецаперацыі ў сакавіку 2008, калі іх агенты выйшлі на Бута пад выглядам прадстаўнікоў FARC і прапанавалі прадаць ім 100 ракет класа «зямля — паветра», некалькі верталётаў, супрацьракетныя ўстаноўкі, а таксама арганізаваць выкід зброі з самалёта на тэрыторыю Калумбіі.

• **У Германіі бацька выратаваў дачку з мядзведжых лапаў.** Драматычнае здарэнне адбылося ў заапарку Люнебаха на паўднёвым захадзе Германіі. Дзяўчынка залезла на агароджу мядзведжага вальера і ўпала. 34-гадовы бацька кінуўся туды, але гімалайскі мядзведзь першы падбег да дзіцяці і параніў яму лапай лоб. Бацька схапіў дачку і здолеў збегчы з ёй за агароджу, хоць мядзведзь параніў яму нагу. Абаіх даставілі ў шпіталь. Іх жыццю нічога не пагражае.

• **Два пасажырскія цягнікі сутыкнуліся са статкам кароў пад Дуброўнай.** Пацярпелых сярод пасажыраў і персаналу цягнікоў Гродна—Масква і Масква—Варшава няма. Час затрымкі руху цягнікоў склаў 1 гадзіну. У выніку сутыкнення загінулі 47 кароў, астатнія разбегліся.

• **З пачатку года на дарогах Беларусі загінула 19 дзяцей.** 318 атрымалі траўмы. Гэта прыкладна на чвэрць меней, чым летась.

**МБ; БелаПАН**

# Мы гаворым «Ленін»...

Лeнініяна нашых вуліц і станцый — гэта мост у «саюз нерушымы». Піша **Віталь Тарас**.



Нядаўна я стаў уладальнікам незвычайнай пластыкавай карткі. На ёй ёсць знак Visa Electron, партрэт Леніна і надпіс буйнымі літарамі: «Госбанк СССР». Яшчэ там ёсць скрыжаваныя серп і відэлец, а таксама лічбы — 1917 1941 1945 1991. Лёгка здагадацца, што нічога зняць з гэтай карткі ні ў адным банкамаце нельга. Гэта магніцік, які мне прывезлі з парку Грутас пад Вільняй.

Там у свайго роду музеі-запаведніку сабраны скульптуры ды іншыя выявы Леніна і Сталіна з усёй Літвы. Ідэя прыйшла да галавы прадпрымальніку Вілюмасу Малінаўскасу, які раней займаўся экспартам марынаваных грыбоў. (Як тут не ўспомніць стваральніка «Попмеханікі» нябожчыка Курохіна з яго тэорыяй, што Ленін быў грыбам.) Прадпрыемства прыносіць немалы даход — сюды прыязджаюць турысты з усяго свету і ахвотна купляюць сувеніры. На Захадзе гэтае месца называюць Ленінлэнд.

У Беларусі падобная ідэя, кажучы сучаснай мовай, не пакаціла б. Мінск і без таго ўжо трапіў у замежныя турыстычныя даведнікі як архітэктурны помнік эпохі камунізму. Дый уся Рэспубліка Беларусь з незлічонай колькасцю помнікаў правадыру ды вуліц Леніна можа лічыцца музеем-запаведнікам — без усялякіх «як бы».

Праўда, галоўны праспект сталіцы даўно не носіць імя Леніна. Цяпер ён называецца праспект Незалежнасці. Так называецца і плошча перад Домам урада, дзе стаіць помнік Леніну.

Са станцыі метро, што пад гэтай плошчай, нязграбную кампазіцыю ў выглядзе галавы правадыра даўно прыбралі. А вось старая назва станцыі — «Плошча Леніна» — засталася.

Сёлета ў сакавіку, здавалася, лёд крануўся. Тапанімічная камісія пры гарвыканкаме рэкамендавала ў ліку шэрагу перайменаванняў у горадзе назваць згаданую станцыю «Плошча Незалежнасці», што было б лагічна. У сваёй тагачаснай нататцы ў «НН» пад назвай «Шкілет у метро», напісанай з нагоды рашэння тапанімічнай камісіі, я выказаў боязь: паколькі перайменаванне станцыі належала яшчэ абмеркаваць у друку (на абмеркаванне было вылучана два тыдні), у гэтага рашэння знойдзецца шмат праціўнікаў з ліку камуністаў. З таго часу мінула ўжо не два тыдні — амаль паўгода, але назва станцыі не змянілася. Але ў чым я памыліўся, дык гэта ў сваім прагнозе, што меркаванае перайменаванне выкліча масавы супраціў савецкіх ветэранаў.

Дарэчы, калі гадоў пятнаццаць таму з пляцоўкі перад цяперашняй рэзідэнцыяй прэзідэнта (колішняга будынка ЦК КПБ) на вуліцы Маркса ў адну ноч прыбралі бюсты Маркса і Энгельса, таксама не было маніфестацый ці нават пікетаў у абарону заснавальнікаў марксізму-ленінізму. Дык што, марксізм у сучаснай Беларусі ўжо нікога не цікавіць, а ленінізм вырашана пакінуць?

Думаю, што марксісцка-ленінская тэорыя, у тым ліку тэорыя ўзброенага паўстання, тут ні пры чым. Цяжка назваць цяперашняе кіраўніцтва Расіі (а таксама і Беларусі) прыхільным да якіх бы там ні было рэвалюцый, у тым ліку кастрычніцкай сацыялістычнай. Тое, што маўзалей Леніна ля Крамля суседнічае з праваслаўнымі храмамі (хоць пры Леніну мучылі праваслаўных святароў, разбуралі цэрквы, а сама муміфікацыя зусім не адпавядае хрысціянскім звычаям), нікога, дальбог, не здзіўляе. Як і тое, што парэшткі іншага правадыра — Сталіна, цела якога выкінулі з маўзалея пасля XXII з'езда КПСС, дагэтуль ляжаць побач, ля Крамлёўскай сцяны, у якой пахаваны многія іншыя дзеячы кампартыі. Расійскую праваслаўную царкву Ленін на Краснай плошчы не трывожыць. Праўда, і чэргаў да мошчаў у маўзалеі даўно няма.

Нядаўна споўнілася дваццаць гадоў рашэнню аб поўнай рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсій, якое было прынята ў СССР пры Гарбачову. Але дагэтуль расійская пракуратура не хоча прызнаваць зладзейскае забойства царскай сям'і ў 1918 годзе палітычным і таму адмаўляе яго ахвярам у рэабілітацыі.

Магчыма, Ленін не меў непасрэднага дачынення да забойства Мікалая II і яго сваякоў. (Хоць ёсць вядомы анекдот — гэтак Валодзя Ульянаў адпомсціў за павешанага брата.)

Але ж паводле звестак праваабарончай арганізацыі «Мемарыял», у Савецкай Расіі, а потым у Савецкім Саюзе да пачатку 1950-х гадоў загінулі звыш 30 мільёнаў чалавек. 13 мільёнаў з іх — падчас Грамадзянскай вайны. Першыя канцлагеры з'явіліся менавіта пры Леніну. Вось за гэта, а таксама за чырвоны тэрор эпохі «ваеннага камунізму», ён нясе непасрэдную гістарычную адказнасць. Дарэчы, Ленін ніколі яе з сябе не здымаў. І называў рэчы сваімі імёнамі: тэрор — тэрорам, рэпрэсіі — рэпрэсіямі, а не «шчаслівым савецкім жыццём», як гэта было пры Сталіну.

Няма сэнсу параўноўваць, хто з гэтых двух людзей больш «матери-истории ценен». Як кажуць — абодва горшыя. Але справа ў тым, што Ленін быў выдатным рэвалюцыянерам і неардынарнай асобай. Гэта зусім не значыць, што рэвалюцыянерам трэба ўзводзіць помнікі. Напрыклад, помнікаў Троцкаму — непасрэднаму кіраўніку ўзброенага паўстання ў Петраградзе ў 1917 — у Расіі няма.

Але ці шмат прыгадаеце твораў, прысвечаных правадыру рэвалюцыі, якія мелі б сапраўдную мастацкую вартасць? Тыя, хто быў у згаданым парку Грутас, кажуць, што быць там доўга, сярод агромністай колькасці помнікаў правадырам, цяжка. Гэтае манументальнае «мастацтва» прыгнятае, ціснe на псіхіку. А што казаць пры выродлівых цэментавых балванаў у кожным беларускім райцэнтры?

Якім бы таленавітым ні быў скульптар, зрабіць мастацкі партрэт Леніна немагчыма было ў прынцыпе. Бо не з гэтай мэтай тыя статуі ствараліся. Гэта быў хрэстаматыйны, глянцавы Ленін, папярэднік вялікага таварыша Сталіна. Яны павінны былі стаяць — і стаялі — побач як непахісны сімвал таталітарнай савецкай дзяржавы.

У той час казалі: Сталін — гэта Ленін сёння. Сёння, як ні парадаксальна, можна сказаць: Ленін — гэта Сталін сёння. Альбо, перафразуючы паэта, «мы говорым — Ленін, разумеем — Сталін». Менавіта яму, а не Леніну, сёння прысягаюць на вернасць тыя, хто аднаўляе ў маскоўскім метрапалітэне надпіс са словамі старога савецкага гімна «нас вырасціў Сталін...». Менавіта па ім адчуваюць сёння настальгію былыя ахоўнікі ГУЛАГа, сексоты, следчыя-садысты, пракуроры — спадкаемцы Вышынскага, суддзі «самага справядлівага і гуманнага суда ў свеце». Ды хіба толькі яны? Усе, хто лічаць, што распад СССР быў найвялікшай геапалітычнай трагедыяй, таксама настальгуюць па савецкай эпосе.

Мядзведзеў і Пуцін сёлета асудзілі злачынствы сталінізму ў сувязі з 70-й гадавінай катынскай трагедыі. Здавалася б — адназначна і канчаткова. Але ў музей «Лінія Сталіна» пад Мінскам (як і ў Грутас) па-ранейшаму ахвотна едуць турысты, у тым ліку, расійскія. Здавалася б, якое дачыненне маюць Сталін і Ленін да сённяшняй суверэннай Беларусі? Хай бы расійцы самі ў сябе разбіраліся з іх спадчынай, спрачаліся — ці захоўваць непахаваным труп у самым сэрцы сваёй краіны.

Але ж Ленін, застыглы ў манументах, не дарма застаецца недатыкальным сімвалам. Ён сімвалізуе мост у савецкую эпоху — эпоху «саюза нерушымага». Гэты мост мы яшчэ не спалілі. І нават змяніць назву станцыі метро на «плошча Незалежнасці» ніяк не рашымся.

ЖАРТ




# Дажынкі за 350 мільярдаў

Працяг са старонкі 1.

**Жанчына зноў яе перапыняе:**

— Свята таксама трэба. Свята з свята. Радасць павінна быць у людзей. У сэрцы радасць.

**Малады хлопец:**

— Канечне ж, прыкольна. Гэта свята.

— А чым добра?

— Ну як — чым добра? Народ збіраецца, гуляе. Гэта ж клёва. А на што яшчэ выдаткоўваць?

**Любоў:**

Ммм, вельмі вялікая сума. Думаю, што трэба паразважаць над гэтым пытаннем. Вельмі вялікая сума, пагэтаму, думаю, не трэба. Ёсць больш куды патраціць грошы ў нашай дзяржаве.

**Бабуля:**

— Ну як, для горада гэта трэба. Гэта ідзе больш на добраўпарадкаванне горада, чым на Дажынкі самі.

**Жанчына ў акулярах:**

— Патрэбны, райцэнтры прыгажэюць.

**Пенсіянер:**

— У такім маштабе можа і не патрэбна, а ўвогуле патрэбны.

А грошы патраціць... На ўзмацненне здароўя людзей, на сацыяльную падтрымку пенсіянераў.

А вось, что думаю наконт гэтага жыхары Ліды:

**Дзмітрый:**

— Так, добра, горад змяняецца.

**Марыя:**

— Добра, бо горад аднавілі.

**Ігар, мясцовы жыхар:**

— Горад прыгожы стаў, цэнтр. Я, напрыклад, кватэру атрымаў у новай хаце.

**Вячаслаў:**

— Я рады, што ў нас Дажынкі, горад зменіцца. Усё да лепшага.

**Ганна Навумовіч**

# Выйшаў новы ARCHE




- **Юры Шэрах (Шавялёў).** Праблемы фармавання беларускай мовы
- **Крысціян Швейгард Станг.** Заходнярускай канцылярская мова ВКЛ
- **Гародня: сляды яўрэйскага жыцця**
- **Вталь Сіліцкі.** Кухонная апазіцыя гаворыць па-руску
- **Картэр Элвуд.** Што еў Ленін

# Часовы паверэны Эстоніі ў Беларусі трапіў у сэкс-скандал

Эстонскія СМІ паведамляюць, што часовы кіраўнік дыпмісіі ў Мінску Хары Лахтэйн падаў у адстаўку. 20-гадовая жыхарка беларускай сталіцы абвінаваціла дыпламата ў дамаганнях. Міністэрства замежных справаў прыняло ягонае прашэнне аб адстаўцы.

Вечарам у панядзелак беларуска даслала ананімны ліст у розныя арганізацыі, а таксама інфармацыйныя агенцтвы, дзе апісвае сутнасць справы.

Да ліста прыкладаўся дадатак з фотаздымкамі, дзе выяўлены Лахтэйн з рознымі жанчынамі ў рэстаранах. На некаторых мужчына трымае сваіх спадарожніц за грудзі.

У лісце было пазначана, што з эстонцам дзяўчына пазнаёмілася дзесьці год таму, пасля ж «стала ахвярай яго сэксуальных дамаганняў». У знак падзякі дыпламат нібыта зрабіў дзяўчыне, а таксама яе сяброўкам шэнгенскія візы.

Дырэктар рэстарана «Госці», дзе адпачываў Лахтэйн, Любоў Сачыўка кажа, што сапраўды на мінулым тыдні ў іх з'яўляўся дыпламат у суправаджэнні чатырох дзяўчат. Тым не менш, па словах Сачыўкі, эстонец з'ехаў з рэстарана адзін.

Міністр замежных справаў Эстоніі Урмас Паэт зазначыў, што рашэнне аб адстаўцы — «свабодны выбар Лахтэйна». Што тычыцца фатаграфій, то ён кажа, што яшчэ нічога не даказана.

Падобны кампрамат ужо неаднаразова ўсплываў на іншых дыпламатаў, што працавалі ў Беларусі. Звычайна такія скандалы інспіруюцца спецслужбамі.

**Зміцер Панкавец**




# Даенне мышэй за грошы саюзнай дзяржавы

**У Акадэміі навук атрымліваюць малако ад трансгенных мышэй.**

У межах саюзнай дзяржавы развіваюцца сумесныя навуковыя праекты, засяроджаныя на вывучэнні космасу, нанатэхналогій ды мікрабіялогіі. Пераважная большасць бягучых навукова-тэхнічных праграмаў саюзнай дзяржавы разлічаныя да 2015 года.

24 жніўня на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальнай акадэміі навук навукоўцы паведамілі аб прыярытэтных накірунках навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў высокатэхналагічных сферах.

Акадэмія навук выступае замоўцам-каардынатарам міждзяржаўнай праграмы Еўразійскай эканамічнай супольнасці «Інавацыйныя біятэхналогіі» на 2011—2015 гады. Асноўная ўвага будзе сканцэнтраваная на атрыманні прафілактычных і дыягнастычных прэпаратаў, выпрабаванні новых лекаў.

Ініцыятарам праграмы ЕўраАзЭС вядучы прэс-канферэнцыі назваў дырэктара Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі Эмілію Каламіец. Аднак Эмілія Іванаўна сціпла адмовілася, спасылаючыся на ініцыятыву беларускага прэзідэнта ў гэтым пытанні. «Расія яшчэ магла б абысціся без Беларусі, а нам складаней абысціся без Расіі», — пракаментавала сумесныя праекты Эмілія Каламіец.

Сярод значных вынікаў рэалізацыі мінулых праграмаў беларускія навукоўцы адзначаюць свае дасягненні ў грыд-тэхналогіях, што ўжываюцца для мадэлявання і апрацоўкі дадзеных у Вялікім адронным калайдары. Упершыню ў свеце распрацаваныя камплекты праграмнага забеспячэння прамежкавага ўзроўню UNICORE, сістэмы аналізу, статыстыкі і ўліку рэсурсаў. Гэта сталася асновай для стварэння ў Беларусі функцыянальнага ўчастка Нацыянальнай грыд-сеткі, якая будзе інтэграваная ў еўрапейскую.

> «Мы, па сутнасці, адзіны народ», — рэзюмаваў намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей Рахманаў.

Канструктыўна-тэхналагічнае рашэнне беларускіх навукоўцаў дазволіла атрымаць суперкампутар гібрыднай метакластэрнай архітэктуры СКІФ, які ўваходзіць у сусветны рэйтынг Топ-500. Праграма «СКІФ» распачалася ў 2007 годзе і сёлета заканчваецца. «У гэтым напрамку зроблены значны прарыў», — мяркуе Аляксандр Тузікаў, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблемаў інфарматыкі НАН Беларусі.

Цяпер ажыццяўляецца трэцяя саюзная праграма «Космас-НТ». Як распавёў Аляксандр Тузікаў, мэта цяперашняга праекта — стварэнне і апрацоўка новых тэхналогій для атрымання звестак дыстанцыйнага зандавання Зямлі, уніфікацыі мікраспадарожнікавай платформы. У межах праекта выкарыстоўваецца адзінае ў краінах СНД абсталяванне — тарцовы холаўскі паскаральнік, што дазваляе ў наземных умовах ажыццявіць выпрабаванне матэрыялаў цеплаховы спадарожнікаў, мадэлюючы ўмовы ўваходу апарата ў шчыльныя слаі атмасферы.

Айчынныя нанатэхнолагі займаюцца стварэннем доследных арбітальных і наземных сродкаў для ўжытку ў розных галінах тэхнікі. У якасці вынікаў чакаецца павялічэнне тэрміну жывучасці абсталявання ў экстрэмальных умовах касмічнай прасторы.

У межах праграмы «БелРосТрансген-2» навукоўцы займаюцца тэхналогіямі распрацоўкі лекаў новага пакалення, харчовых прадуктаў. Ужо цяпер у лабараторыі магчыма даіць трансгенных мышэй і атрымліваць малако. Актыўна ідзе ўкараненне чалавечага бялку лактаферыну ў жывёлах-вытворцах. Лактаферын змяшчаецца ў малацэ маці, напрацоўкі ў гэтай галіне дапамогуць стварыць карысныя дзіцячае харчаванне і лекі.

У сумесных праграмах прадугледжана супрацоўніцтва на мясцовым узроўні. У Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцях, напрыклад, ажыццяўляюся памежны навуковы праект па вывучэнні наступстваў Чарнобыля. У хуткім часе, імаверна, у межах саюзных праграмаў распачнецца гістарычнае вывучэнне Полацка як цэнтра славянскай культуры.

Беларусы хутка асвойваюць і ўжываюць новыя тэхналогіі, хваліліся адмыслоўцы.

Увогуле, прэс-канферэнцыя праходзіла ў бравурнай танальнасці. Сучасны заробак маладога беларускага навукоўца залежыць ад яго актыўнасці, але нават малаактыўныя супрацоўнікі маюць неабходны мінімум, казалі дырэктары. Уцёкі мазгавітых беларусаў на працу ў замежжа не катастрафічныя, лічаць у Акадэміі навук.

«У беларускай ментальнасці касмапалітызм не моцна выяўлены. Беларус, дзе б ён ні працаваў, заўсёды падтрымлівае ўзаемасувязі з радзімаю», — сціпла мяркуе намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей Рахманаў.

Па словах спадара Рахманава, у беларуска-расійскіх адносінах аніякіх праблемаў ніколі не назіралася. «Мы, па сутнасці, адзіны народ», — рэзюмаваў беларускі навуковец Сяргей Рахманаў.

З гэтай заявай Рахманава многія паспрачаюцца. А вось ці варты былі мышы даення, пакажа час.



**Юльян Місюкевіч**

ПРЫШЛІЦЕ КАРЭСПАНДЭНТА

## Кватэрныя баталіі каля Лідскага замка

Жыхарка Ліды Марыя Разанава патэлефанавала ў Рэдакцыю і сказала, што да яе прыязджае АМАП высяляць з хаты. Карэспандэнты «НН» спехам паехалі ў Ліду.

Жыве спадарыня Марыя на «славутай» вуліцы Замкавай. Славутасць у тым, што гэтую вуліцу, забудаваную прыватнымі дамкамі, адсяляюць у рамках добраўпарадкавання горада перад Дажынкамі. Людзям выдзяляюць кватэры, а на месцы іх хат капаюць штучнае возера.

Перасяленне і звязаныя з ім маёмасныя пытанні часам уздымаюць старыя сямейныя супярэчнасці. Так здарылася і ў выпадку Марыі Разанавай. Яе дом — сярод апошніх, што засталіся на Замкавай. Тут, акрамя жанчыны, жывуць яшчэ яе сын, дачка і зяць, а таксама прапісаны былы муж, з якім Разанава разведзеная. Усім прапісаным у хаце — а гэта фактычна тры сям'і, хоць і звязаныя сваяцтвам, — мясцовыя ўлады прапануюць трохпакаёвую кватэру ў цэнтры Ліды. У новым доме.

«Мы напісалі заяву, што не супраць гэтую кватэру атрымаць, але без майго былога мужа», — кажа Марыя Разанава. Яна збіраецца судзіцца з райвыканкамам за яшчэ адно жытло. Разанава пойдзе ў суд з дакументамі, якія пацвярджаюць, што яны з мужам мелі розныя кватэры ў адным доме, мелі розныя разліковыя рахункі і плацілі асобна камунальныя.

Ці мае права жанчына жыць асобна ад былога мужа?

Начальнік упраўлення па прававой працы Лідскага райвыканкама Леанід Ніскавузы дакавае з дакументамі на руках: «Яна пражывала ў жылым памяшканні (доме дзяржаўнай уласнасці, сацыяльным жытлі!) на 37,7 кв.м. Ёй было прапанавана 76,1 кв. м, добраўпарадкаваная кватэра ў цэнтры горада. Дамова па найме жылога памяшкання была адна, і мы з гэтага сыходзім. Можна мець некалькі мужоў і жонак, але гэта пытанні іншага характару. Разанава хоча атрымаць дзве кватэры, але яна не можа атрымаць болей, чым ёй належыць па законе», — адзначае Л.Ніскавузы.

Юрысты патлумачылі нам, што гарвыканкам у гэтай сітуацыі мае рацыю. Але, на іх думку, Марыя Разанава мае маленькі шанец на перамогу ў судзе, калі дакажа, што ў дзвюх дамовах наймy Разанавым 4 гады таму, адразу пасля разводу, было адмоўлена неабгрунтавана.

**Настасся Шамрэй**

## Сцісла

**• Вольга Карач — лаўрэатка міжнароднай прэміі за мужнасць.** Віцебскай праваабаронцы прысудзілі міжнародную Радэбойльскую прэмію. Прэмія названая ў гонар нямецкага мястэчка Радэбойль (прыгарад Дрэздэна), дзе ў 1645 годзе было падпісана перамір'е ў Трыццацігадовай вайне (1618—1648). Ад 2004 года Радэбойльская прэмія мужнасці прысуджаецца грамадскаму дзеячу з Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Эўропы за заслугі ў справе абароны грамадскіх інтарэсаў, аховы прыроды і правоў чалавека.

**• Прэзідэнт Расіі сустрэўся з лідэрам гурта U2.** Дзмітрый Мядзведзеў прыняў у сваёй рэзідэнцыі «Бачароў Ручай» вядомага ірландскага спевака Бона. Раней да Бона з просьбай расказаць прэзідэнту Расеі пра праслед актывістаў звярталіся абаронцы Хімкінскага лесу, якія спрабуюць выратаваць яго ад высечкі пад хуткасную трасу.

**МБ**

# У Брэсце разгараецца новы карупцыйны скандал

**Галоўным упраўленнем па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС затрыманы пасярэднік у перадачы буйнога хабару, прызначанага для службовых асоб.**

Інфармацыі па новым карупцыйным скандале пакуль мала. Як высветліў «Ежедневник», аператыўнікамі быў затрыманы 55-гадовы жыхар Брэста, які з лістапада 2009 па жнівень 2010-га падбухторваў двух дырэктараў буйных прадпрыемстваў да перадачы хабару службовым асобам праваахоўных органаў за спрыяльнае вырашэнне пытання аб вызваленні іх ад крымінальнай адказнасці. У межах дамоўленасці пасярэднік атрымаў 150 мільёнаў рублёў, пасля чаго быў затрыманы.

Цікавасць у гэтай гісторыі ўяўляе тое, дырэктары якіх прадпрыемстваў заплацілі за вызваленне ад крымінальнай адказнасці. Гэта дырэктар ЗАТ «Брэстаблрапс» і генеральны дырэктар СП «Сельскагаспадарчыя паслугі».

Менавіта гэтымі прадпрыемствамі апошнім часам займаўся Камітэт дзяржаўнага кантролю, які ў жніўні апынуўся ў цэнтры антыкарупцыйнай аперацыі, распачатай Камітэтам дзяржбяспекі.

Нагадаем, што падчас гэтай аперацыі быў арыштаваны начальнік упраўлення па расследаванні злачынстваў дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Дзмітрый Адамовіч.

У МУС пакуль не выдаюць інфармацыю аб тым, для каго браў грошы пасярэднік.

У свой час прыватнае прадпрыемства ЗАТ «Брэстаблрапс» абавязалася пабудаваць завод па вытворчасці рапсавага алею ў Брэсцкай вобласці. Таму яно было ўключана ў дзяржпраграму развіцця галіны і атрымала дзяржзамову. Больш за тое, ЗАТ «Брэстаблрапс» атрымаў шэраг ільгот не толькі пад будаўніцтва завода, але і пад закуп у людзей рапсу. Аднак сваіх абавязальніцтваў прадпрыемства не выканала. Як заявіў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць, «фізасобы атрымалі дзяржзаказ і заняліся замест перапрацоўкі рэалізацыяй гэтага рапсу як камерцыйная структура». КДК правёў праверку прадпрыемства і выявіў факты пратэкцыянізму з боку асобных чыноўнікаў.

Так, напрыклад, было выяўлена, што фірма яшчэ ў 2006 была ўключаная ў спіс перапрацоўчых прадпрыемстваў, якім з бюджэту была выдзеленая матэрыяльная дапамога для закупу насення рапсу.

ЗАТ «Брэстаблрапс» было выдаткавана 100 мільёнаў рублёў, у той час як перапрацоўчы завод нават не пачынаў яшчэ будавацца. Рапс, вядома, быў закуплены, але ў далейшым выкарыстаны ў камерцыйных мэтах — насенне было вывезенае за мяжу.

Старшыня КДК Зянон Ломаць тады заявіў, што дзяржкантроль мае намер жорстка разабрацца з гэтым прадпрыемствам і высветліць, «на якой падставе ЗАТ было ўключана Брэсцкім аблвыканкамам у пералік дзяржзамоваў».

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі запатрабаваў ад КДК не толькі правесці дадатковыя праверачныя мерапрыемствы па выкананні ЗАТ «Брэстаблрапс» дзяржзамовы, але і перадаць матэрыялы ў Дэпартамент фінансавых расследаванняў альбо ў іншыя праваахоўныя органы для прававой ацэнкі дзеянняў кіраўнікоў прадпрыемства. Аднак нават праз два гады КДК не распачаў ніякіх дзеянняў, каб прыцягнуць да адказнасці кіраўнікоў ЗАТ «Брэстаблрапс».

Затое ў час, калі над ЗАТ «Брэстаблрапс» пачалі згушчацца хмары, на дырэктара прадпрыемства і выйшаў пасярэднік з прапановай даць на лапу каму трэба.

Цяпер у дачыненні да затрыманага пасярэдніка распачатая крымінальная справа па прыкметах здзяйснення ім злачынства, прадугледжанага ч.5 арт.16, ч.2 арт.431 Крымінальнага кодэкса Беларусі (падбухторванне да давання хабару ў буйным памеры). Вядзецца прапрацоўка яго сувязяў з мэтай высвятлення пытання, каму ён меў намер перадаць атрыманыя 150 мільёнаў рублёў.

**Ej.by**

# Спажывай беларускае: дыні, кавуны і вінаград

**Пацяпленне клімату — селекцыянеры працуюць над айчыннымі гатункамі экзотаў.**

Мінуў той час, калі мандарыны з'яўляліся на сталах толькі па вялікіх святах. А бананы, набытыя з вялікай цяжкасцю, раскладвалі на падваконні, каб даспелі. Сёння тыя ж бананы ў сезон каштуюць танней за маладую бульбу. Для многіх з нас цытрусавыя, бананы, вінаград ды кавуны з дынямі сталі амаль сваімі. Але не ўсе ведаюць, што тыя ж кавуны і дыні ў хуткім часе сваімі стануць у літаральным сэнсе. Мае пачацца іх вырошчванне ў Беларусі ў прамысловых маштабах. Такую магчымасць даюць дасягненні селекцыянераў і змены клімату.

## Прыжыліся перцы, прыжывуцца і кавуны

Дырэктар Інстытута пладаводства Аляксандр Аутка любіць прыгадваць гісторыю дваццацігадовай даўніны. На адной з нарадаў ён выклікаў усмешкі заявай пра тое, што ў хуткім часе ў Беларусі з'явяцца ўласныя перцы. Каго цяпер здзівіш выгадаваным на беларускім лецішчы перчыкам?

На сёння на доследным полі Інстытута пладаводства ў Самахвалавічах ужо трэці год гадуюць кавуны і дыні. Вучоныя высвятляюць перспектывы вырошчвання гэтых бахчавых у прамысловых маштабах. Доследныя дзялянкі ёсць у Гомельскім, Рэчыцкім і Кобрынскім раёнах. Даследаванні адбываюцца ў рамках дзяржаўнай праграмы.

Па словах супрацоўнікаў інстытута ў Самахвалавічах, добры ўраджай дыняў і кавуноў быў атрыманы тут ужо ў першы год доследаў. Летась было неспрыяльнае надвор'е. А сёлета зноў чакаецца добры ўраджай.

Пакуль вучоныя займаюцца доследамі, прадпрыемства з кітайскім капіталам ЗААТ «СінаБелАгра» ў Пружанскім раёне абяцае першы вялікі ўраджай кавуноў, дыняў, а таксама перцаў і баклажанаў ужо зараз.

## Вяртанне вінаграднікаў

Вінаград у Беларусі мае без перабольшвання тысячагадовую прапіску. Першая згадка пра яго датуецца 1005 годам. У прамысловых жа маштабах беларусы пачалі вырошчваць яго адносна нядаўна. У 1930—1950-я гады вінаград айчынных, а таксама гібрыдных гатункаў вырошчваўся на прамысловых плантацыях на поўдні і паўднёвым захадзе краіны. Пры канцы 50-х праграма была згорнутая Масквой як «немэтазгодная». Аднак невялікія плантацыі перажылі гэтую забарону.

Летась на Гомельшчыне была закладзеная плантацыя вінаграднікаў плошчай 10 га. Гэта першая спроба аднавіць вырошчванне вінаграду ў Беларусі ў прамысловых маштабах. А заадно і перайсці ў перспектыве да вытворчасці каньяку з уласнай сыравіны. У хуткім часе вінаграднікі могуць з'явіцца ў Старадарожскім раёне.

## Беларускія пайза, чуміза і сорга

Глабальнае пацяпленне зрабіла магчымым вырошчваць у Беларусі не толькі дыні з кавунамі. Услед за кукурузай летняя гарачыня прыводзіць да нас новыя, нетрадыцыйныя для нашага краю прасяныя культуры — чумізу, пайзу, сорга, суданскую траву. Пайза, якая здаўна вырошчвалася ў Індыі, Кітаі ды Японіі, ужо два гады як культывуецца ў шэрагу раёнаў Мінскай вобласці. Гэта багатая бялком культура, якая выкарыстоўваецца на зялёны корм. На корм будзе вырошчвацца і сорга. Дагэтуль беларусы былі знаёмыя з гэтай культурай хіба толькі ў выглядзе венікаў.

Селекцыяй культураў з малавядомымі большасці беларусаў назвамі займаецца жодзінскі Навукова-практычны цэнтр па земляробстве.

**Сямён Печанко**



СЯМЁН ПЕЧАНКА



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Залагоджванне студэнтаў

**Стыпендыі выраслі на 11%.**

17 жніўня Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ №425 «Аб павелічэнні памераў усіх відаў дзяржаўных стыпендый». Як часта здараецца, нарматыўны акт прыняты задняй датай — пераразлік будзе зроблены з 1 чэрвеня.

Стыпендыі павялічацца на 11%. Цяпер студэнты ВНУ будуць атрымліваць на 12—20 тысяч рублёў больш. Максімальная стыпендыя складзе 182 тысячы рублёў, мінімальная — 113 тысяч рублёў.

Напрыклад, у галоўнай ВНУ краіны, Беларускім дзяржаўным універсітэце, пераразлік адбудзецца ў канцы верасня. Гэта значыцца, што даплата за чатыры месяцы складзе каля 80 тысяч рублёў.

У каледжах і ПТВ дапамога навучэнцам будзе ад 95 да 153 тысяч рублёў. Апошні раз памер стыпендый павялічваўся ў пачатку года, калі рост склаў 5%. Паводле інфармацыі прэс-службы кіраўніка дзяржавы, указ прыняты «ў мэтах далейшага павышэння сацыяльнай абароны навучэнцаў і студэнтаў». Аднак найбольш верагоднай прычынай такой шчодрасці бачацца хуткія прэзідэнцкія выбары. Як і падчас мінулых кампаній, Лукашэнка страецца залагодзіць найбольш пратэстную групу грамадства. Пра гэта сведчыць той факт, што ў апошнія гады стыпендыі ніколі не павялічваліся двойчы за год.

**Яўген Васількоў**

## Сцісла

• **Наведванне інтэрнэт-кавярняў скарацілася на сорак працэнтаў.** Асноўная прычына — «пашпартны кантроль» на ўваходзе. Аб гэтым карэспандэнту «Нашай Нівы» паведамілі ў адной з мінскіх інтэрнэт-кавярняў. Намеснік дырэктара прасіў не ўказваць назву кавярні, бо супрацоўнікі ўвогуле пабойваюцца даваць каментары адносна славутага ўказа №60. «Рэч у тым, што ліпень і жнівень увогуле месяцы не паказальныя — наведванняў мала. Але ўсё адно, «дзякуючы» новаму ўказу, наведвальнікаў стала працэнтаў на сорак менш. Дакументы людзі з сабой не носяць — гэта факт». Пра відэаназіранне, якое як быццам магло замяніць абавязковы «пашпартны кантроль», кажуць, што гэта не болей чым чуткі.

• **Жаніх на ўласным вяселлі ледзь не зарэзаў бармэнку.** Гэта здарылася 19 жніўня ў адной баранавіцкай кавярні. Там праходзіла святочная вячэра з нагоды шлюбу 33-гадовага месціча. Вяселле, як і трэба, спявала, скакала і біла посуд. Аднак калі бармэнка папрасіла жаніха заплаціць за пабітыя шклянкі, той павёў сябе неадэкватна: спачатку выбег з кавярні, а вярнуўшыся, накінуўся на работніцу з нажом, — распавялі ў аддзеле крымінальнага вышуку Баранавіцкага ГАУС. Мужчына парэзаў жанчыне твар, галаву, плячо і калені. Наведвальнікі, каб супакоіць кавалера, ляснулі па галаве бутэлькай. Іначай усё магло б скончыцца трагічна. Мужчыну затрымалі. Як высветлілася, ён стаіць на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансеры. У дачыненні да яго распачалі крымінальную справу па артыкуле «замах на забойства».

**Юрась Ускоў; intex-press.by**

# X. Гандлёвы канкурэнт Ноўгарада

Піша **Алег Дзярновіч**.

Працяг. Пачатак у №26, 28, 30, 39, 47 за 2009 год, №7, 22, 27, 29 за 2010 год.

На сярэдзіну IX ст. мы маем археалагічныя сведчанні пра існаванне Полацка. Маем таксама першую летапісную гадку, а таксама незвычайна багатую скандынаўскую літаратурна-гістарычную традыцыю паданняў пра гэты горад (праўда, пісьмова зафіксаваных пазней). Але пра якія рэальныя падзеі на берагах Дзвіны ў той час усё ж можна казаць?

### «Паўночная канфедэрацыя»

Замацаванне ў Полацку (мы не ведаем, як называлі тагачасны горад на гэтым месцы) дружынніка Рурыка азначала, што Сярэдняе Падзвінне ўваходзіла ў так званую «Паўночную канфедэрацыю плямён». Гэтым штучным, наватвораным тэрмінам гісторыкі пазначаюць тэрыторыі і плямёны, з якіх сплачвалася даніна варагам яшчэ да 862 г. і на якія ўрэшце гэтыя варагі былі зноў запрошаныя. Вядома, даніну тых часоў не варта мадэрнізаваць і разглядаць як сучасны дзяржаўны падатак, але ж пэўная рэгулярнасць і дамоўленасць тут прысутнічае. Гэта ўжо важны этап на шляху станаўлення дзяржаўнасці.

Сам Рурык асеў у Ладазе — на беразе ракі Волхаў, не надта далёка ад паўднёвага берага Ладажскага возера. Але досыць далёка ад Полацка і Дзвіны. Ладага мела таксама шведскую назву — Альдэйг'я ці Альдэйг'юборг (Aldeigja, Aldeigjuborg), што, як мяркуецца, паходзіць ад старажытна-фінскага.* Ад шведскай, дарэчы, паходзіць і славянская назва паселішча, а не ад субстратнай фінскай.

Як высвятляецца, скандынавы трапілі на поўнач Усходняй Еўропы раней за славянаў — на карысць гэтага сведчыць і археалогія. Першае паселішча ў Ладазе, верагодна, было заснаванае готландцамі. Першыя бярвёны для яго будоўлі былі ссечаныя, як паказвае дэндрахраналагічны аналіз, да 753 г. Але ўжо ў 760-я гады Альдэйг'я была разбураная славенамі, якія стварылі на месцы шведскага паселішча сваё, з іншымі культурнымі традыцыямі — замест пабудоў слупавых канструкцый з'явіліся славянскія зрубы. Але ў 830-х Ладага зноў была ўзята варагамі і менавіта тут, паводле Іпацьеўскага летапісу, замацаваўся Рурык: «І прыдоша к славенем первае і срубіша горад Ладагу і сядзе старэйшын у Ладаге Рурык». Праўда, у іншых варыянтах сцвярджаецца, што ён сеў княжыць у Рурыкавым гарадзішчы, ад якога і пайшоў Ноўгарад.

Чаму важныя для нас усе гэтыя падрабязнасці? Не толькі для таго, каб яшчэ раз выказацца па тэме «нарманскай праблемы», але і паказаць, што першапачаткова варагі засвойвалі так званы «Усходні шлях» — зону Балтыйска-Волжскага шляху (Нява — Ладажскае возера — Волхаў — Волга-Окскае міжрэчча). Гэта шлях, які вёў на поўдзень, у Візантыю і Арабскі халіфат, што прыцягвалі варагаў сваімі багаццямі, магчымасцю наймацца на службу да імператара, а таксама выгаднымі пастаўкамі туды рабоў. Лясныя абшары Усходняй Еўропы першапачаткова цікавілі мабільныя варажскія аддзелы толькі ў такой інструментальна-дапаможнай функцыі.

Але існаваў карацейшы маршрут «Усходняга шляху» — з Балтыкі наўпрост праз Дзвіну і ў Дняпро. Гэты шлях пралягаў праз Палтэск'ю (Полацк). Якраз нарвежска-ісландскім вікінгам ён быў выгаднейшы, невыпадкова такая ўвага нададзена Палтэск'і ў Ісландскіх каралеўскіх сагах. І, як заўважыў Алег Латышонак, усе нарманы, як гістарычныя, так і легендарныя, якіх можна звязваць з гісторыяй Беларусі, — нарвегі.

І вось гэтая канкурэнцыя між рознымі этнічнымі і гандлёвымі карпарацыямі справакавала ўдар па Полацку. У Ніканаўскім летапісе захаваліся звесткі, як у 865 г. альбо ў 867 г. «ваяваша Аскольд і Дзір палачан і многі зла стварыша».

### Кіеўскія ўзурпатары

Легендарны вараг Аскольд (імя, магчыма, паходзіць ад старажытна-ісландскага Haskuldr ці Höskuldr) быў кіеўскім князем у 864—882 гг. і ўладарыў сумесна з Дзірам. Сведчанні пра жыццё Аскольда вельмі супярэчлівыя. У наш час сярод гісторыкаў найбольш пашыраная версія, выкладзеная аўтарам «Аповесці мінулых гадоў». Паводле яе, Аскольд і Дзір былі дружыннікамі князя Рурыка, якіх той у 864 г. адпусціў на іх просьбу ў паход на Канстанцінопаль. Але, праплываючы на сваіх дракарах паўз Кіеў, які кантраляваўся хазарамі, яны захапілі горад і ўвогуле ўсталявалі сваю ўладу над палянамі.

З паходжаннем імя Дзіра сітуацыя зусім заблытаная. Пашыраная гістарычная версія выводзіць яго ад скандынаўскага «dyr» ці «djur» — «звер». Паводле іншай версіі, гэтае імя-мянушка мае славянскія ці цюркскія (хазарскія альбо булгарскія) карані. Частка гісторыкаў у аповедзе пра Аскольда і Дзіра бачыць наслаенне некалькіх сюжэтаў, а Дзір, мауляў, як можна вывесці з арабскіх крыніц, «першы сярод славянскіх князёў», быў уладаром Кіева да Аскольда.

Тым не менш, паводле летапісаў, у 866 г. Аскольд і Дзір з дзвюма сотнямі караблёў усё ж дайшлі да Царграда. Імператар Міхал і патрыярх Фоцій маліліся цэлую ноч у царкве Святой Багародзіцы. На наступны дзень вынеслі яны з песнямі боскую рызу Святой Багародзіцы і намачылі яе крысо ў моры. «Была ў гэты час цішыня, і мора было спакойнае, але тут раптам узнялася бура з ветрам ды з хвалямі, раскідала яна караблі бязбожных русаў, і прыбіла іх да мора, і пераламала». Нямногім удалося пазбегнуць бяды і вярнуцца дамоў.

Незалежна ад таго, ці да выправы на Канстанцінопаль, ці пасля яе Аскольд і Дзір здзейснілі напад на Полацк, праўдападобна яны дзейнічалі тады яшчэ ў рэчышчы палітыкі Рурыка. Таксама выглядае, што ўсталяванне ўлады варагаў-русі ў Полацку, звязаным таксама з нарвегамі, адбывалася не без канфліктаў.

Паводле летапісаў, Рурык памёр у 879 г. і перадаў княжанне свайму родзічу Хельгу (Алегу), даручыўшы яму выхоўваць таксама свайго малалетняга сына Інгвара (Ігара). У 882 г. Алег сам выступіў у паход, узяўшы з сабой «варагаў, чудзь, славен, меру, весь, крывічоў». Усталяваўшы сваю ўладу ў Смаленску і Любечы, Алег, паводле летапісаў, быў здзіўлены, даведаўшыся, што ў Кіеве ўладараць Аскольд і Дзір. Наўгародскі князь, паводле легенды, падманам выцягнуў кіеўскіх князёў да сваёй ладдзі, дзе былі схаваныя дружыннікі. Аскольду і Дзіру было сказана, што паўз Кіеў «у Грэкі» праплываюць купцы ад Алега і княжыча Ігара. Калі ж Аскольд і Дзір выйшлі да «сваіх родзічаў», Алег заявіў ім: «Не князі вы і не княскага роду, але я княскага роду»; ды паказаў ім Ігара: «Гэта сын Рурыка». Аскольд і Дзір былі забітыя. Месца Аскольдавай магілы і сёння вылучаецца ў тапаграфіі Кіева. Алег абвінаваціў Аскольда і Дзіра ў нелігітымнасці іх улады і сам захапіў кантроль над Дняпром. Вось гэтая дата — 882 г. — вельмі ўмоўна лічыцца годам утварэння Рускай дзяржавы, аб'яднаннем Поўначы і Поўдня Усходняй Еўропы.

Полацк жа, як бачым, таксама трапляе ў арбіту Кіева. У 907 г. палачане бяруць удзел у выправе Алега на Царград і сярод іншых гарадоў атрымліваюць пасля заключэння міру ўзнагароду ў 12 грыўняў. Але далей звесткі пра сувязі Полацка з Кіевам размываюцца. Імператар Канстанцін Парфірародны ў сваім трактаце «Пра кіраванне імперыяй» згадвае гарады, якія плацілі даніну Кіеву, — сярод іх названы Смаленск, але адсутнічае Полацк. Смаленск быў самым аддаленым і паваротным пунктам «палюддзя» кіеўскіх князёў — штогадовага аб'езду падначаленых плямён з мэтай збору даніны. У 947 г. кіеўская княгіня Вольга пачынае ставіць у падпарадкаваных землях пагосты, рэгламентуючы памер даніны. Гэтая маштабная акцыя закранала Драўлянскую зямлю, Пскоўшчыну, Наўгародчыну, Падняпроўе і Падзісенне, але не тычылася Полацкай зямлі. Імкненне замацавацца на дзвінскім адгалінаванні шляху «з варяг у грэкі» і неабходнасць падтрымаць каланізацыйны рух крывічоў у заходнім, паўночна-заходнім і паўднёва-заходніх кірунках адштурхоўвалі полацкіх князёў ад сувязяў з Кіевам ды спрыялі адасабленню Полацка.

Новы скандынаўскі імпульс у абліччы Рагвалода прыўнёс у гэты працэс новыя тэндэнцыі. Пра гэта — у наступным выпуску.




**Дракар («карабель-дракон») вікінгаў. Габелен з Баё (канец XI ст., Нармандыя). 35—60-метровыя дракары мелі да 65 пар вёслаў, што дазваляла ім дасягаць хуткасці да 10—12 вузлоў (18—22 км/г). Гэта забяспечвала варагам вельмі добрую для таго часу мабільнасць на водных шляхах.**



**Смерць Аскольда і Дзіра. Фёдар Бруні (XIX ст.).**

* Alode–jogi — «нізоўе ракі» ці «ніжняя рака».

# Неспадзяванае вяртанне вінілу

Піша **Юрась Ускоў**.

У Еўропе вяртаецца мода на вінілавыя кружэлкі. Кожная буйная дыскарня цяпер мае аддзел вінілу, дзе можна купіць як старыя, так і новыя плыткі. Новая музыка, акрамя версіі на кампакт-дыску, цяпер выдаецца і на вініле. Да Беларусі «вінілавы бум» павінен дабрацца ў бліжэйшы час, а вось месцаў, дзе можна набыць якасныя кружэлкі, не так і шмат.

### Еўрапейская настальгія

Упершыню з еўрапейскай модай на вініл я сутыкнуўся ў Вільні, дзе ў самым цэнтры старога горада працуе крама Thelonious (названая ў гонар джазавага піяніста Тэлоніуса Монка). Аказалася, што вось гэтая сціплая крама ў сутарэнні на вуліцы Шкляной (Stikliu), 12 — ледзьве не еўрапейскі цэнтр вінілавага гандлю. Прынамсі, ва Усходняй Еўропе пра краму ведаюць бадай што ўсе аматары вінілу. Цэны на «пластмасу» (як называюць кружэлкі самі меламаны) не вельмі «кусачыя» — ад 6 да 60 тысяч на беларускія грошы, прычым залежыць цана ад стану кружэлкі і краіны вытворцы. І тут высветліўся цікавы факт: прадавец вельмі зацікавіўся вінілавым гандлем у Мінску і ўрэшце расказаў пра асноўны недахоп «Тэлоніуса»:

— Чаго нам насамрэч бракуе, дык гэта савецкіх кружэлак з чымсьці кшталту Кабзона. Мы ў савецкія часы гэтага нічога не куплялі — думалі, што яно не скончыцца ніколі, дый жадання гэта слухаць не было ніякага. А цяпер вось арыгінальных пласцінак The Beatles — бяры не хачу, а вось Кабзона яшчэ пашукаць трэба. А тут час ад часу такая настальгія пачынаецца — і ўсім гэтыя запісы трэба. Можа, у Мінску ёсць?

Гэта напраўду здзівіла — тое, што у нас пыліцца на паліцах, а часам сустракаецца на сметніцы, аказваецца, уяўляе з сябе каштоўнасць у Еўропе.

### Вінілавыя маршруты

Калісьці на вуліцы Леніна існавала крама «Ноты», дзе сярод іншага можна было знайсці і вініл. Цяпер крама пераехала на праспект Пераможцаў пад Камсамольскае возера (пра што, дарэчы, ведаюць не ўсе). Кружэлкі ў новых «Нотах» ляжаць у дзвюх кардонных каробках — у прынцыпе, іх варта захоўваць па-іншаму. Дый каталог знізіўся — знайсці тут нешта вартае ўвагі вельмі цяжка, а кошты на савецкія дыскі вышэйшыя, чым у іншых месцах.

— Ды нікому яно не трэба, — кажа прадавец. — Ну, глядзіце самі, што тут за рэпертуар. З цікавага толькі класіка, і яе няшмат.

Зусім іншая сітуацыя склалася на «галоўным вінілавым» рынку.

### Клуб філафаністаў

Клуб філафаністаў віруе па суботах у ДК Трактарнага завода. Вініл тут таксама можна набыць — прычым гэта будуць сапраўдныя старыя фірмовыя пласцінкі, і цана ў іх ад васьмі даляраў па курсе. З мінусаў — усе гэтыя гады большасць пласцінак не на паліцы праляжалі, а некаторыя з іх дык увогуле жорстка эксплуатаваліся. І «рэпертуар» гэтых пласцінак трэба разглядаць з пазіцыі густаў савецкіх меламанаў 1970-х і 1980-х — а гэта значыць, што тут квітнее англійскі хард- і арт-рок, а ўсяго іншага вельмі і вельмі мала.

Яшчэ адна асаблівасць «клуба» — так званы «гістарычны аспект». Прадаўцы найперш глядзяць на ўзрост купца, і, калі вам менш за сорак, у большасці выпадкаў стаўленне да вас будзе, як да чалавека, які нічога не разумее ні ў вініле, ні ў музыцы.

### Vinylshop.by

Таксама існуе інтэрнэт-крама vinylshop.by, дзе пра кожную кружэлку, якая выстаўлена на продаж, пададзена вычарпальная інфармацыя. Але цэны скуголяць: сярэдняя цана 25 даляраў, што ўдвая даражэй, чым у віленскіх калег.

І выбар прадукцыі нешырокі, затое якасць кружэлак не выклікае дакораў, а калі штосьці не так — супрацоўнікі папярэджваюць. Заказаць і атрымаць кружэлку можна з рук у рукі ў Мінску, а ў іншых гарадах — праз пошту, але, зразумела, невядома, у якім стане яна да вас дабярэцца ў выніку.

Асобна трэба ўзгадаць краму «Містэрыя гуку», што ва ўнівермагу «Рыга». Там прадаецца сучасны вініл — запісы могуць быць і 60-х, і 70-х, і нават 2000-х, бо на вініле цяпер дублюецца амаль усё, што выходзіць. Каштуе такая кружэлка ад 60 да 160 тысяч, але мае адзін недахоп. Рэч у тым, што гэтыя вініла па гучанні не адрозніваюцца ад кампакт-дыскаў, бо амаль усе яны — «лічбавыя перавыданні» (Digitally Remastered). Значыцца, розніца між купляй кампакта і вінілу амаль знікае. Апошні набываецца хутчэй для каларыту — праз пэўны час на ім з'явяцца пашкоджанні, якія нададуць яму класічны трэск. Розніца для беларусаў — у цане, хаця ў Еўропе сучасны вініл і сучасны кампакт-дыск каштуюць супастаўна, але нам да гэтага яшчэ далёка.



СЯМЁН ПЕЧАНКА

**Топ-5 вінілавых кружэлак, якія варта мець у калекцыі:**

**1. Песняры. «Ты мне вясною прыснілася».** Гэты дэбютны альбом мае некалькі моцных хітоў і дагэтуль слухаецца на адным дыханні.

**2. Мроя. «Дваццаць восьмая зорка».** Гэты дыск можа паказацца наіўным, але ён добра адлюстроўвае канец 1980-х, калі ён толькі выйшаў. Найважнейшае вінілавае выданне ў гісторыі беларускага року, прычым яшчэ на «ўсесаюзнай» фірме грамзапісаў «Мелодыя».

**3. Станіслаў Манюшка.** Опера «Страшны двор». Опера, якая ў перакладзе часцей за ўсё называецца «Зачараваны замак». Самы папулярны вініл беларускай акадэмічнай музыкі.

**4. Міхал Клеафас Агінскі.** Паланез «Развітанне з Радзімай». Такі міні-вініл заўжды выдаваўся з якойсьці неабавязковай п'есай іншага кампазітара на другім баку, але нават вокладка даказвала, што ўся пласцінка рабілася менавіта для паланеза.

**5. Аркестр Эдзі Рознэра. «Бывай, каханне!»** «Белы Армстронг», найвыбітнейшы беларускі джазмэн, чые запісы ў 1970-я гады мусілі быць размагнічаны, але ўсё ж такі частка з іх захавалася. Абавязковая кружэлка ў калекцыі аматара свінгу.

### Сцісла

• **Скандальнае відэа «Твары Украіны» выпусціў тэлеканал «Інтэр».** Да Дня незалежнасці краіны, які святкуюць 24 жніўня, украінскі канал выдаў у эфір серыю сацыяльных ролікаў. Іх мэта — уславіць адзінства ўсіх нацыянальнасцяў, якія жывуць у краіне. У кожным з мініфільмаў адна з нацыянальнасцяў спявае ўкраінскі гімн на сваёй роднай мове.

Беларусаў паказалі сялянамі, замілаванымі бульбай.

А ў расейцаў прысутнічае гармонік і «ендова» з расолам.

У выніку ролік выклікаў скандал у Севастопалі. Прарасейскія дзеячы назвалі яго «абразлівым» — маўляў, у астатніх роліках усе занятыя справай, і толькі герой відэа пра ўкраінскіх расейцаў палёжвае на ложку, пачэсваючы ніз жывата.

• **«Стомленага д'ябла» Сяргея Кавалёва паставілі ў Славаччыне.** Тэатр горада Сеніца паставіў спектакль па п'есе беларускага драматурга ў перакладзе на загарацкую гаворку, дыялект славацкай мовы. Рэжысёр сеніцкага тэатра Záhorácké divadlo Іван Фодар кажа, што на ягоныя спектаклі па-славацку прыходзіла мала людзей. Затое поўны аншлаг на пастаноўках па-загарацку. Загор'е — раён Славакіі, які мяжуе з Чэхіяй. Тут склалася свая самабытная культура і свой дыялект славацкай мовы — пераходны да мараўскіх дыялектаў чэшскай. На ім размаўляе каля 200 тысяч чалавек.

Два гады таму ў Кошыцкім лялечным тэатры беларускі рэжысёр Алег Жугжда паставіў «Піліпку і ведзьму» Кавалёва.

Сяргей Кавалёў — доктар філалогіі, драматург. Нарадзіўся ў 1963 у Магілёве. Працаваў на філфаку БДУ. Цяпер выкладае ў Любліне ва ўніверсітэце імя Складоўскай-Кюры.

**МБ**







**ТБМ апублікавала каляндар да 80-годдзя Караткевіча. Ён ахоплівае другое паўгоддзе 2010 г. і першае — 2011-га. Набыць каляндар можна ў незалежных распаўсюднікаў.**

СМЯЛЕЙ!

## Надыходзіць «Бардаўская восень»





Арганізатары найстарэйшага і самага душэўнага фестывалю беларускай аўтарскай песні абвесцілі прыём заяваў на конкурсную частку «Бардаўскай восені — 2010». Фестываль пашырыў сваю стылістычную накіраванасць, таму на ім прадстаўляецца творчасць не толькі бардаў, але і акустычных бэндаў, дуэтаў, трыа ды рок-гуртоў у фармаце unplugged. Найбольш годнага ўдзельніка фэсту ў Бельску абяруць наведнікі сайта «Тузін гітоў».

Фэст будзе праходзіць у 17 раз.

У мінулыя гады з фестывальнай сцэны спявалі Алесь Камоцкі, Зміцер Вайцюшкевіч і WZ-Orkiestra, Віктар Шалкевіч, Кася Камоцкая, Тацццяна Беланогая, Лявон Вольскі і акустычны N.R.M., гурт «Босае сонца», праект «Народны альбом», Юры Несцярэнка, Алег Кабзар.

Летась Гран-пры фэсту ўзяш гурт Re1ikt, які мае рокавы рэпертуар у акустычным гучанні.

Адзіны крытэр для ўдзелу ў конкурсе — наяўнасць беларускамоўнага тэксту ў кампазіцыях выканаўцы, а таксама паўналецце.

Для ўдзелу ў адборачным канцэрце на конкурсную праграму фестывалю выканаўца мусіць даслаць заяўку на ўдзел разам з дэма-запісам на паштовую скрыню wosien@tut.by да 10 верасня 2010 года ўключна.

Адборачны канцэрт адбудзецца ў Мінску пры канцы верасня.

Сёлета ў адборы на фестываль будзе новаўвядзенне. Адзін з прэтэндэнтаў трапіць у Бельск аўтаматычна, калі атрымае перамогу ў адмысловым галасаванні на сайце інфармацыйнага партнёра «Бардаўскай восені» — інтэрнэт-партале «Тузін гітоў».

# «У гасцях у кандыдата»: Яраслаў Раманчук



Чым можа павярнуцца візіт дзвюх прывабных дзяўчат у кватэру не менш прывабнага халасцяка? Не спяшайцеся рабіць паспешлівыя высновы.

Бо дзяўчаты гэтыя — фатограф «Нашай Нівы» Юлія Дарашкевіч і карэспандэнтка «Салідарнасці» Анастасія Зелянкова. Прывабны ж халасцяк — не хто іншы, як прэтэндэнт на прэзідэнцкі пост Яраслаў Раманчук. Ён і стаў першай ахвярай нашага супольнага праекта «У гасцях у кандыдата».

## Зайздросны жаніх

— Будзьце асцярожныя! — у адзін голас наказалі нам рэдактары, даведаўшыся пра блізкі візіт.

Успрыняўшы сказанае як рэкламу, мы паспяшаліся да Раманчука.

— Рады вас бачыць, — з парога прывітаў нас гаспадар. — Праходзьце на кухню, будзем піць каву з цукеркамі. Спіртнога не прапаную, бо сам не п'ю.

Ніхто адмаўляцца і не думаў. Тым больш што да цукерак прыкладаўся яшчэ і вафельны торцік. А каву гаспадар не паленаваўся зварыць уласнаручна.

— Можа, яшчэ і посуд самі мыеце? — з'едліва пацікавіліся мы, назіраючы за ўпэўненымі рухамі Раманчука.

— Вядома. Насамрэч гэта стэрэатып. Што тут цяжкага? Я і бульбу люблю абіраць. Потым змалоў на машынцы — вось табе і дранікі за пяць хвілін!

Мы з зайздрасцю паглядзелі на падваконне — у бок партрэта сімпатычнай дзяўчыны (да апошняга мы шчыра верылі, што размовы пра нявесту — гэта толькі піяр).

— Значыць, гатаваць вы любіце?

— Ну так. Хоць, бывае, часам і пельмені смажу, але гэта як даніна студэнцкім часам.

Звыклыя не давяраць словам палітыкаў, мы папрасілі дазволу праінспектаваць лядоўню кандыдата. Усё як у людзей: гародніна, садавіна, каўбасы, у маразілцы мяса, а не паўфабрыкаты, на паліцах — рондлі. Нават не верыцца, што гэта лядоўня халасцяка.

— А што ў рондлі? — працягнулі мы журналісцкае расследаванне.

— Халаднік.

Вось і папаўся! Ну хто паверыць, што мужчына будзе сам сабе халаднік гатаваць?

— Не, не яварыў, — шчыра прызнаўся Яраслаў.

Аднак іншых слядоў прысутнасці ў доме жанчыны мы не знайшлі (за выключэннем флакона туалетнай вады на паліцы ў ваннай). Мы, вядома, асабліва і не разлічвалі ўбачыць раскіданыя па ўсёй кватэры прадметы жаночага гардэроба, але тут усё было відавочна: ні табе фіраначак на вокнах, ні вазачак з кветачкамі, ні мілых сувеніраў на паліцах. Усё проста, па-мужчынску, але з густам.

Пакуль варылася кава, мы вырашылі ўважлівей агледзець кватэру. Высветлілася, што гэтую «двушку» ў раёне Камароўкі Раманчук набыў яшчэ ў 1998 годзе.

— Я спецыяльна заняўся бізнэсам, каб купіць кватэру. Праўда, купіў толькі калі бізнэс кінуў, — смяецца Яраслаў. — Пачакаў, пакуль цэны апусцяцца да мінімуму (нездарма ж эканаміст). Цяпер вось жыву ў цэнтры горада, і праца побач.

Проста, як у показцы: багатыя купляюць сабе не машыну, каб ездзіць на працу, а кватэру побач з працай, каб хадзіць пешшу. Дарэчы, у Раманчука машыны таксама няма.

## «Гняздо распусты»

Агляд вырашылі пачаць са спальні. Пасля «эратычнага інтэрв'ю» «Народнай волі» гэты пакой уяўляўся нам як мінімум гняздом распусты. Нашы чаканні спраўдзіліся толькі напалову.

З выгляду ўсё было цалкам прыстойна: убудаваная шафа, вялікі ложак, гара кніжак на падлозе, туалетны столік (набыты, мяркуючы па ўсім, проста ў камплекце з ложкам).

У вочы нам адразу ж кінуўся прафесійны фотаапарат з вялізнымі аб'ектывамі, што ляжаў на люстэрку. Вось толькі кожная ў гэты момант падумала пра сваё: Юля тут жа прызнала ў Раманчуку калегу па фотасправе, мяне ж мучыла пытанне: чаму ўсё гэта знаходзіцца ў спальні?

Пакуль фатограф-прафесіянал і фатограф-аматар размаўлялі на свае вузкаспецыяльныя тэмы, я выпрабавала ложак. Ён аказаўся жорсткім і чамусьці зусім не рыпеў, хоць, па прызнанні кандыдата, стаіць тут з 1998 года.

— Няўжо рэдка карыстаецеся? — усё-такі не стрымала я цікаўнасці.

— Крыўдзіш, — тут жа азваўся Яраслаў. — Паглядзіце, на чым ён у мяне стаіць.

Ён падняў покрыва, і мы ўбачылі пад ложкам... кнігі, складзеныя стосам у якасці падпорак. Мяркуючы па ўсім, свой рэсурс гэты ложак ужо вычарпаў.

— Будзем правяраць? — падміргнуў Раманчук.

— Як-небудзь іншым разам, — паспрабавалі аджартавацца мы.




**Нават не верыцца, што гэта лядоўня халасцяка.**




**Кнігі пра экзатычны сэкс стаяць на паліцах побач са шматтомнікамі па эканоміцы.**



Яраслаў практыкуе ёгу.



Хто яшчэ з кандыдатаў у прэзідэнты так зможа?

— Лаўлю на слове!

— А дзе вы захоўвайце свае гальштукі? — для бяспекі вырашылі мы змяніць тэму і заадно ненавязліва зазірнуць у шафу кандыдата.

Раманчук без ценю сумневу расчыніў дзверкі і пачаў дэманстраваць сваю калекцыю. Гальштукаў у яго і сапраўды аказалася шмат. Нават іменны.

— Праўда, завязваць сам не ўмею. Прашу сяброў, — прызнаўся Раманчук.

А вось кнігі на падлозе каля ложка прызначаліся для ўдзельнікаў школы, якую вядзе Раманчук на базе Цэнтра Мізэса.

— Часам збіраемся ў мяне дома, — расказаў кандыдат і прадбачліва ўдакладніў: — У суседнім пакоі. Бывае, выязджаем кудынебудзь. Нядаўна на Нарач ездзілі. Пойдзем пакажу фатаграфіі.

Так мы плаўна перамясціліся ў гасцёўню.

## Эканамічная Камасутра

Мяркуючы па фотаздымках, да навучання Раманчук ставіцца нестандартна. Людзі ў купальніках мала нагадвалі ўдзельнікаў эканамічнага семінара. Ды і праграма заняткаў выглядала вельмі нават прывабна (я тут жа пашкадавала, што рэдактар надоечы адмовіўся мяне туды адпускаць).

— Дарэчы, некалькі параў пасля нашых заняткаў ажаніліся, — пахваліўся сваёй роляй Купідона кандыдат.

Ад кампутарных здымкаў перайшлі да фотаальбомаў. Вось Раманчук з Маргарэт Тэтчэр, вось з Сямёнам Шарэцкім, вось перакладае Кебічу, шмат фота з рознымі еўрапейскімі міністрамі. Але асноўная частка альбома — дзяўчаты, дзяўчаты, дзяўчаты. На каленях, у абдымку, на фоне сэкс-шопа...

— Калі я ішоў на парламенцкія выбары дэпутатам па Гродзенскай акрузе ў 2008 годзе, спецслужбы закінулі ў народ дзве качкі: што я хачу прадаць Гродна Польшчы і што я гей, — смяецца Раманчук. — Прычым нават не ведаю, што для гарадзенцаў было горш.

Мы тут жа ўявілі, як Раманчук даказваў гарадзенкам адваротнае, і засмяяліся.

Сама ж гасцёўня змяшчала адначасова і бібліятэку, і працоўны кабінет. На паліцах — узнагароды Раманчука за плённую працу на эканамічнай ніве. На стэлажах — кнігі, у тым ліку і ўласнага аўтарства.

— А вось у гэтых папках я захоўваю выразкі розных цікавых артыкулаў па тэме, — паказаў Яраслаў на верхнюю паліцу стэлажа.

Аднак нашу ўвагу прыцягнулі зусім не эканамічныя працы, а ўзгрувашчаная на іх «Камасутра» і яшчэ нейкая эратычная кніжка з малюнкамі.

— «Камасутру» мне падаравалі падчас паездкі на форум у Індыю. Іншым лектарам дасталіся кніжкі па эканоміцы, а мне, як самаму маладому, уручылі гэтую. Вырашылі, што патрэбнейшая. Тут, дарэчы, прапісаныя 40 правілаў, якія павінна ведаць жанчына. Вось зараз я вас і праверу.

Да нашай вялікай радасці, ад гэтага экзамену нас выратаваў тэлефонны званок. Так мы ад «Камасутры» плаўна перайшлі да ёгі.

Высветлілася, што і гэтым Раманчук займаецца з задавальненнем. Прапусціць магчымасць пафатаграфаваць кандыдата ў розных позах мы не маглі.

— А можаце, як ёг, у вузел завязацца? — падбухторвалі мы.

— Магу. Толькі для гэтага трэба болей размяцца, а то потым і не развяжашся, — засмяяўся Яраслаў.

Мы вырашылі паберагчы кандыдата для гісторыі.

Ёга аказалася не адзіным захапленнем Раманчука. З шафы тут жа дасталіся ракеткі для вялікага тэніса і пінг-понга, трэнажоры, а доказаў футбольнай актыўнасці кандыдата пасля прагляду яго фота нават і не патрабавалася.

Яшчэ крыху пахадзіўшы па кватэры, вывучыўшы ў ваннай усе шкляначкі (яны, дарэчы, у Раманчука таксама асаблівыя — замежныя, нават пасту ён купляе упакоўкамі толькі ў Амерыцы), мы нарэшце вырашылі, што трэба і меру ведаць.

— Ну, дарогу да мяне цяпер ведаеце. Так што заходзьце ў любы час, — ветліва запрашаў нас кандыдат.

Мы горача паабяцалі вярнуцца.

**Настасся Зелянкова,**
**фота Юліі Дарашкевіч**



Фота з універсітэцкай дошкі гонару.



Мы доўга шукалі жаночыя сляды ў кватэры Яраслава. У ваннай знайшоўся толькі жаночы парфум.



Затое ў фотаальбоме пераважаюць дзяўчаты.




## ІМПРЭЗЫ

**Незвычайны выходны**

**У Музеі народнай архітэктуры і побыту 28 жніўня ад 12-й да 15-й** вас чакае «Незвычайны выхадны, ці Казачная вандроўка для дзяцей і дарослых». У гэты дзень разам з Млынаром і Дамавіком вы адправіцеся ў захапляючую вандроўку, каб адалець Ліха Аднавокае. Вы сустрэнеце Жыжаля, Валасняка, Зазоўку і Хапуна.

**Фестываль феерверкаў пад Лагойскам**

Другі міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца» пройдзе **27—28 жніўня ў гарналыжным комплексе «Лагойск»**. Свае майстэрства прадэманструюць піратэхнікі з Італіі, Польшчы, Расіі, Украіны, Эстоніі. Завершыць фестываль пазаконкурсны гала-феерверк ад беларускай каманды «Кальвін», чэмпіёнаў Еўропы 2007 года. Музычную частку фестывалю ўзначаляць гурты **«Бі-2»** і **«Акварыум»** з Расіі. На фестываль можна будзе даехаць спецыяльным аўтобусам з Мінска ці сваім аўто (маецца паркоўка на тры тысячы месцаў). Кошт квітка на кожны дзень складае 80 тысяч рублёў. Даведкі і замова квіткоў: (25) 952–45–55 і на сайце www.soundline.by

**Сучасная шведская харэаграфія**

**У Тэатры беларускай драматургіі 7 і 8 верасня і ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры 5 верасня а 19-й** — вечары шведскай харэаграфіі. Можна будзе ўбачыць пастаноўкі Сібрыг Доктэр «Там, дзе вада цячэ ўгару» і



«Але я не...» Бена Воархама.

**Аксамітны сезон-2010**

**3—4 верасня** — міжнародны фэст пад адкрытым небам «Аксамітны сезон–2010». Двухдзённы міжнародны фестываль пройдзе **за 18 км ад Мінска ў парку прыгодаў «Крутагор'е»**. У праграме выступы гуртоў з Беларусі, Украіны, Аўстрыі і Германіі, на двух сцэнах пройдзе фестываль беларускай актуальнай музыкі «Можна!», запланаваныя шэраг майстар-класаў, паказальных выступаў і гульняў. **Пачнецца «Аксамітны сёзон-2010» 3 верасня а 17-й.** Дастаўка маршрутным таксі ад ст. метро «Каменная горка».

**Прэзентацыя перавыдання «Нашай стравы» — з пачастункам**

**У сераду 25 жніўня, а 18:00 у кнігарні «Логвінава» на Кісялёва**, За адбудзецца прэзентацыя кнігі перавыдання Алеся Белага «Наша страва». Кніга пра культуру беларускай кухні, яе гісторыю, уключае арыгінальныя рэцэпты беларускай кухні. На прэзентацыі выступяць Алесь Белы і Анка Упала (уступнае слова), гурт «Гаротніца». Гасцей чакае і пачастунак.

**Navinki-2010**

**28—29 жніўня ў мастацкай галерэі «Палац мастацтва» (вул.Казлова, 3)** у дванаццаты раз пройдзе міжнародны фестываль перформансу «NAVINKI».
**Адкрыццё фестывалю 28 жніўня ў 11.30.**

## КАНЦЭРТЫ

**Apple Tea**

**1 верасня ў мінскім клубе «Графіці» (зав. Калініна, 16) а 19-й** — Apple Tea.




**Вольскі & Ко**

**3 верасня тамсама а 19-й** — Лявон Вольскі & Ко.

**Апошні герой**

**3 верасня ў «Рэактары» (вул.Харужай, 29) а 19-й** — канцэрт–трыб'ют «Апошні герой» памяці Віктара Цоя і групы «Кіно».

## ВЫСТАВЫ

**Карціна алеем**

**У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а) ад 28 жніўня да 19 верасня** працуе выстава «Карціна алеем». Спалучэнне фота, відэа, інсталяцыі, арт–аб'ектаў і жывапісу.

**Памяць пра Грунвальдскую перамогу**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 жніўня** працуе выстава «Памяць пра Грунвальдскую перамогу», прысвечаная 600–годдзю бітвы.

**Эстонскія кнігі**

**У галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да 19 верасня** працуе выстава «25 лепшых эстонскіх кніг–2009». Усе кнігі створаны і праілюстраваныя выключна эстонскімі мастакамі.

**Традыцыі і культура Японіі**

**У карціннай галерэі імя Г.Вашчанкі (вул. Карповіча, 4, Гомель) да 12 верасня** працуе выстава «Традыцыі і культура Японіі». На выставе — прадметы культуры і побыту Японіі, а таксама макеты храмаў і замкаў, наборы лялек, паветраныя змеі…

**«Песняры». Раскрытае сэрца**

**У Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав. Музычны, 5) да 1 верасня** праходзіць выстава «Песняры». Раскрытае сэрца», на якой прадстаўленыя нотныя рукапісы У.Мулявіна, фотаздымкі, афішы, конкурсныя прызы, дыпломы і сцэнічныя касцюмы «Песняроў».

**Саюз расійскіх мастакоў**

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 28 жніўня** працуе выстава «Саюз расійскіх мастакоў. Новы час». На выставе прадстаўлены 74 творы жывапісу і графікі 35 аўтараў з 14 litарадоў Расіі.

**Паэзія ў будзённасці**

**У Мастацкім музеі да 30 жніўня** працуе рэтраспектыўная выстава жывапісу Барыса Казакова «Паэзія ў будзённасці».

**Гіганты Ледавіковага перыяду**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 жніўня** працуе выстава «Гіганты Ледавіковага перыяду» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт–Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Мадэлі жывёл для выставы адноўлены па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя камп'ютарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і рыкаюць!

**Беларускія ўзоры**

**У Музеі народнага мастацтва (Раўбічы) да 31 жніўня** працуе выстава «Беларускія ўзоры»: пляценне з прыродных матэрыялаў, кераміка, аплікацыя саломкай, ручная коўка, разьба па дрэве.

**Свет з вышыні**

**У Доме-музеі Ваньковічаў (вул.Інтэрнацыянальная, 33а) да 20 верасня** працуе выстава маляваных мапаў Рубена Атаяна «Свет з вышыні».

## КІНО

### Цэнтурыён

**Centurion**

Вялікабрытанія, 2010, каляровы, 97 хв.

**Рэжысёр:** Ніл Маршал

**Ролі выконваюць:** Міхаэль Фасбендэр, Дамінік Уэст, Вольга Курыленка

**Жанр:** Гістарычны «выжывальніцкі» баявік

**Адзнака:** 5 (з 10)




117 год нашай эры. Пікты нападаюць на памежную рымскую крэпасць. Цэнтурыён Квінтус Дыяс — адзіны ацалелы. Герой адпраўляецца ў брытанскія лясы знішчыць кіраўніка варвараў Гарлакона. Але дзікія шатландскія партызаны абвяшчаюць паляванне на рымлянаў.

Карціна Ніла Маршала — жорсткая гульня на выжыванне, толькі па недаглядзе прадусараў пастаўленая ў сціплых гістарычных дэкарацыях. Маршал спецыялізуецца на нізкабюджэтных жахалках. У ягоным «Спуску» альпіністкі змагаліся з канібаламі, у «Сабакахваярах» вайскоўцы біліся з ваўкалакамі.

Брытанскія партызаны — тыя ж ваўкалакі. І метады іхняе барацьбы самыя дзікія. Нягледзячы на імёны імператараў і рымскіх легіёнаў, тым, хто любіць гістарычнае кіно, лепей не турбавацца. Фільм —для аматараў крывавых боек.

**Андрэй Расінскі**

# Радзіма катоў

Генафонд нашых катоў сфармаваўся ў X—XII стагоддзях.

*Помні, Ляша, па Буг наша!*
***Власт «Векавечная мяжа»***



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Беларускія навукоўцы заняліся даследаваннем кацiных папуляцыяў. Зручней за ўсё аналізаваць і параўноўваць генетычную структуру кацiных папуляцый, назіраючы за афарбоўкай жывёл, што залежыць ад многіх генаў. Звычайная афарбоўка беларускага ката — шэры ў паласку. Усе іншыя каляровыя варыяцыі выкліканыя мутацыямі ў адпаведных генах.

Навукоўцы з Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Скарыны пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта НАН Беларусі Рыгора Ганчарэнкі назіралі афарбоўку катоў у 13 гарадах Беларусі, Расеі, Казахстана і Украіны.

У кожнай папуляцыі яны вызначалі частату мутацыяў, што выклікаюць рудую, белую ці чорную афарбоўку поўсці, паслабленне афарбоўкі (пры такой мутацыі генетычна чорныя каты выглядаюць як блакітна-шэрыя, а рудыя — як палевыя), наяўнасць белых плямаў, мармуровыя разводы на футры або доўгую поўсць. Атрыманыя дадзеныя навукоўцы параўналі з вядомымі асаблівасцямі афарбоўкі катоў Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, якія жывуць у Лондане, Дубліне, Глазга, Парыжы, Амстэрдаме, Рыме, Варшаве, Будапешце і Афінах. Вынікі даследаванняў яны апублікавалі ў дакладах Акадэміі навук за 2010 год, т. 431, №6. Кароткую версію артыкула прыводзіць «Информнаука».

Аказалася, што сярод расейскіх, беларускіх і ўкраінскіх катоў даволі шмат чорных і даўгапоўсцевых, у іншых месцах частоты гэтых мутацый перавышалі 70 і нават 80 працэнтаў. Трохі менш было плямістых і рудых, а таксама жывёлін са слабой афарбоўкай (ад 15 да 40%). Белыя і мармуровыя каты сустракаліся найрадзей. У цэлым усе даследаваныя папуляцыі падобныя па частаце розных мутацый, за выключэннем Краснадара і Растова.

Асаблівая сітуацыя склалася з мармуровай афарбоўкай. Яна даволі звыклая для катоў Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, а ў Глазга, Дубліне, Лондане і Парыжы 80—90% катоў маюць разводы на поўсці. У гарадах, дзе адбывалася даследаванне, такія чатырохногія вельмі рэдкія, за выключэннем Санкт-Пецярбурга (44%). На думку даследчыкаў, гэта выклікана тым, што падчас блакады хатнія каты ў Ленінградзе зніклі практычна цалкам, і папуляцыя аднавілася за кошт жывёлін, завезеных у горад, у асноўным з англійскіх партоў.

Беларускія генетыкі пацвердзілі існаванне знойдзенага ў 70-х гадах мінулага стагоддзя своеасаблівага «калідора» Тэгеран—Будапешт, у якім вельмі рэдка сустракаюцца рудыя жывёлы — іх усяго 2—7%. Гэты калідор праходзіць праз Растоў-на-Доне і Краснадар, а таксама Баку і Армавір.

Паводле звестак даследнікаў, прааналізаваныя папуляцыі еўрапейскіх катоў распадаюцца на тры дакладныя групы. Адна ўключае толькі папуляцыі краінаў Заходняй Еўропы.

На думку навукоўцаў, сучасныя заходнееўрапейскія каты — нашчадкі адносна невялікай колькасці асобін, ацалелых у дзвюх сусветных войнах. Другая група — грэка-цэнтральнаеўрапейская, а трэцяя — усходнеславянская. Папуляцыя ўсходнеславянскіх катоў пачала фармавацца ў Падняпроўі ў X—XII стагоддзях пад уплывам гандлёвых кантактаў з варагамі і грэкамі. Далейшае рассяленне катоў па тэрыторыі Расіі, Беларусі і Украіны адбывалася і адбываецца з гэтага рэгіёна, бо нават у даволі аддаленых ад яго гарадах — Маскве, Новасібірску і Алма-Аце — генетычная структура кацiных папуляцый вельмі падобная да падняпроўскай. А вось каты паўднёвых гарадоў, Прыдоння і Кубані бліжэйшыя да грэка-цэнтральнаеўрапейскіх.

**Сяргей Харэўскі**

ЁСЦЬ НАГОДА

## Уцёклыя карпы перайшлі ў «народную ўласнасць»



10 жніўня з рыбгаса «Свіслач», што знаходзіцца ў Асіповіцкім раёне, з-за прарыву запруды ўцякло сто тон карпаў. Адлавіць і вярнуць назад удалося толькі 14 тон рыбы.

— Нашы карпы ўжо даўно ў Бярэзіне, — паведамілі нам у рыбгасе. — Забарону на адлоў рыбы мы ўводзілі, але толькі на тых тэрыторыях, дзе маем на гэта права, а карпы ўжо сышлі і адтуль.

За мінулыя дзесяць дзён карпы паспелі ашчаслівіць шматлікіх беларусаў. У вёсках пачаліся сапраўдныя «рыбныя дні». Карпаў у рацэ шмат, і ловяцца яны элементарна.

Як кажуць жыхары вёскі Ліпень, цяпер яны забяспечаны смажанай і замарожанай рыбай, а таксама юшкай надоўга наперад. Карпы перайшлі ў «народную ўласнасць».

**ЮУ**

### Сцісла

• **Салата ратуе ад дыябету.** Менавіта да такой высновы прыйшлі вучоныя Лестэрскага ўніверсітэта, што назіралі больш чым за 200 тысячамі чалавек. Прычым гаворка ідзе не толькі пра салату, але пра ўсю гародніну, што мае зялёнае лісце. Хто есць добрыя порцыі такой гародніны штодзень, тыя радзей хварэюць на дыябет. Шпінат, шчаўе, салаты, разуха ўтрымліваюць шмат магнію, вітаміну C, што з'яўляюцца антыаксідантамі. Капуста і зялёная цыбуля таксама карысныя.

• **У Дняпры знойдзены ўзбуджальнікі халеры.** Запарожская санэпідэмстанцыя выявіла ў Дняпры вібрыён халеры, цяпер купанне ў горадзе забаронена. Добра, што вібрыёны не плывуць проці плыні.

ЗДАРОЎЕ

## Ад жуйкі да панцыра рака: кідаем паліць

Паводле статыстыкі, у Беларусі курыць не менш як траціна дарослага насельніцтва. І як мінімум кожны другі з іх жадае пазбавіцца ад шкоднай звычкі. Але не можа, ці адкладвае на будучыню, ці не ведае як. «Наша Ніва» склала спіс найбольш папулярных сродкаў для тых, хто хоча развітацца з тытунём.

### Пластыры і таблеткі

Самы папулярны сродак кінуць паліць — медыкаментозны.

Пластыры. Праз іх нікацін патроху паступае ў арганізм, і паліць хочацца нашмат менш. Праблема з пластырам адна — яго цяжка здабыць. Як паведамілі ў даведцы аптэк, «такі тавар у Мінску не прадаецца».

Таблеткі. Існуюць у шматлікіх варыянтах і ў аптэках прадаюцца. Іх трэба прымаць раз на дзве гадзіны, і поўная адмова ад палення наступае літаральна праз пару дзён. Таблеткі таксама ўтрымліваюць нікацін, і, калі вы ўжо выпілі адну, бліжэйшую гадзіну папаліць проста не атрымаецца. Дзве-тры зацяжкі — і вы кідаеце цыгарэту ў сметніцу. Аднак увага: таблеткі маюць шырокі спектр пабочных эфектаў. Яны могуць выклікаць і праблемы са страваваннем, і падвышаную тэмпературу. Што-небудзь адно з гэтага спіса вам забяспечана амаль з поўнай верагоднасцю, але раз вырашылі кінуць паліць, пару дзён можна і пацярпець.

### Жуйкі

Натуральна, што з нікацінам. Прапануецца замест таго, каб паліць, пажаваць адну хвілін дзесяць. Дапамагаюць, бо больш чысты нікацін і яго разбуральны эфект адчуць проста немагчыма. Пасля жуйкі ні пра якое паленне і гаворкі ісці не можа. Пабочных эфектаў няма, акрамя жахлівага смаку ў роце, які будзе трымацца працяглы час пасля кожнага ўжывання.

Да спосабаў псіхалагічнага ўздзеяння на палільшчыка адносяцца кнігі, кшталту «Лёгкі спосаб кінуць паліць». Яны зазвычай добра раскупляюцца, але вось гэты «самы лёгкі спосаб» уздзейнічае далёка не на ўсіх: у першую чаргу, трэба верыць у карысць і сілу кніжных рэцэптаў. Па-другое, кніга здымае псіхалагічную залежнасць ад тытуню, а фізічная павінна знікнуць сама, што бывае далёка не заўжды.

### Народныя метады

Яны выглядаюць досыць жорстка. Але, трэба зазначыць, што некаторыя палільшчыкі кажуць, быццам менавіта яны адзіныя, якія дапамаглі.

Перад паленнем можна жаваць галінку чаромхі — праз два тыдні вы пазбавіцеся ад шкоднай звычкі паліць. Ці замест цыгарэт есці сушаныя долькі ананасаў і чарнасліў ці сыр. Калі не дапамагае, трэба пераходзіць да метадаў імгненнай адмовы.

Напрыклад, панцыр чорнага рачнога рака высушыць і расцерці, атрыманы парашок змяшаць з тытунем і набіць цыгарэту. Што будзе далей — народныя крыніцы не расказваюць. Але здагадацца няцяжка. Яшчэ можна апусціць цыгарэту ў малако, высушыць і выпаліць. Лепш за ўсё гэта рабіць дома, бо пасля вам дакладна стане дрэнна. Эфект на некалькі дзён, а можа і гадоў, забяспечаны.

Абавязковы ж складонік кожнага спосабу лекаванння — сіла волі і сапраўды моцнае жаданне адмовіцца ад звычкі труціць сябе і сваіх блізкіх.

**Юрась Ускоў**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Суп з памідораў

1,25—1,5 кг ялавічыны, набор карэння, 6—8 памідораў, соль, 1 французская булка, 100 г масла.

Узяць некалькі чырвоных памідораў, прыбраць хвосцікі, разрэзаць надвое ўпоперак, выціснуць сок і выбраць зярняты (яны не будуць выкарыстаныя). 100 г масла распусціць у рондалі, палажыць туды памідоры і некалькі лустаў мякішу булкі, нарэзаных кубікамі, заліць булёнам з ялавічыны і варыць 15 хвілін. Пасля чаго працадзіць суп праз густое сіта і разбавіць такой колькасцю булёну, каб суп не быў занадта рэдкім. Перад падачай пракіпяціць і дадаць у суп грэнкі. Для прыгатавання грэнак верхнюю і ніжнюю скарынку булкі, якія засталіся, калі мякіш бралі для запраўкі супу, намазаць маслам і падсушыць у печы.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Спадара Харанэку Уладзіміра віншую** з Днём народзінаў, 37-годдзем. Жадаю здзяйснення ўсіх мар і задум. Аляксей.

**Віншуем Алеся і Караліну Лукашэвічаў** з заснаваннем новай ячэйкі грамадства. У Светлы Шлях! Сябры па няшчасці.

**ПРАДАМ**

**Прадаецца электракававарка-эспрэса** Zespresso Cafe. Т.: (025) 697-81-91; (029) 392-39-00. Lebiedz@tut.by.

**Прадам зб. вершаў** В.Трэнас, А.Хадановіча, час. «Тэксты» 2004, 2007 г. Т.: (029) 332-69-56. Святлана.

**ПРАЦА**

**Шукаю** выкладчыка матэматыкі для заняткаў з вучнямі 8–9 класаў. Т.: (029) 774-22-47.

**ПАДАРОЖЖА**

**Запрашаем** у сяброўскае падарожжа 12 верасня па маршруце: Мінск—Мікелеўшчына—Правыя Масты—Белавічы—Струбніца—Пескі—Самуйлавічы Дольныя—Вялікая Рагозніца—Крамяніца—Мінск. Т.: 262-73-43, (029) 111-73-32.

**КНІГІ**

**Прадам** т. 2, 9–10 Беларускай Энцыклапедыі ў 18 т. Т.: 298-16-62.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) У чатырох сясцёр па адным браце. Колькі дзяцей у сям'і?

2) Дзве дачкі, дзве маці з'елі тры яблыкі. Колькі яблыкаў з'еў кожны?

3) У трох братоў па сястры. Колькі дзяцей у сям'і?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Залатыя хлопцы з барысаўскага БАТЭ перамаглі партугальскі «Марыціму» з лікам 3:0 у першым матчы плэй-оф Лігі Еўропы.



У Маскве апазіцыя сабрала на мітынг тры тысячы чалавек. Акцыя ў абарону Хімкінскага лесу прайшла з удзелам саліста «ДДТ» Юрыя Шаўчука. Лес маюць забудаваць дарагімі дамамі.




На камені пры дарозе Полацак — Вільня ў Глыбоцкім раёне супрацоўнікі лясгаса намалявалі лесніка. Ляснік аказаўся надта ўжо падобны да Лукашэнкі.




SVABODA.ORG

Беларуская Індыя. Вулічны рынак у мястэчку Хвоенск (Жыткавіцкі раён).



DRUGOI.LIVEJOURNAL.COM

У разгар фінальнага матча футбольнага Суперкубка на стадыёне ў Та-Калі (Мальта) на поле выбегла кацяня. Варатар яго эвакуяваў.



БЕЛАПАН

У адным з дачных пасёлкаў Стаўбцоўскага раёна над хатамі масава лунаюць нацыянальныя штандары.
Фотакарэспандэнт налічыў адразу тры дамы, на якіх установлены афіцыйны сцяг Беларускай Народнай Рэспублікі. Аднак, паводле слоў гаспадароў лецішчаў, сцягоў нашмат больш. Некаторыя ўладальнікі вывешваннем бел-чырвона-белага сцяга адзначаюць сваё з'яўленне ў загарадным доме. Адзін з суразмоўцаў растлумачыў: «Мы проста любім Беларусь і маем актыўную грамадзянскую пазіцыю».
Дах адной з дач упрыгожвае флюгер з гербам «Пагоня».

Ад Рэдактара. Калі ласка, дасылайце і Вы нам фоты ўсяго цікавага, што бачыце ў час сваіх падарожжаў. Пошта «НН» запамінаецца лёгка: nn@nn.by.



БЕЛАПАН

## Анекдоты

* * *
Яна і ён.
— А цяпер, Рамане, як прыстойны мужчына, вы павінны са мной ажаніцца!..
— Як прыстойны мужчына я ўжо жанаты!
* * *
Маленькі сын забягае ў пакой да маці і горка плача.
Маці:
— Сыне, чаму ты плачаш???
Сын, праз слёзы:
— Мы з татам былі на рыбалцы, тата злавіў вялікую рыбу, а калі выцягваў вуду, леска абарвалася і рыба ўцякла.
Маці, усміхаючыся:
— Ну, чаго тут плакаць, сынок?!. Ты ўжо дарослы хлопчык і павінен разумець, што ў такіх сітуацыях трэба не плакаць, а смяяцца!
— Дык я і засмяяўся!..
* * *
Прапаршчык:
— Ёсць сярод вас хто-небудзь з музычнай адукацыяй?
— Ёсць, я!
— І я!
— Аднясіце ў клуб піяніна!
— А для чаго тут музычная адукацыя?
— Каб не паперлі штосьці іншае!
* * *
Учора чарговы раз пераканаўся, наколькі шкодна паліць.
Пайшоў на кухню скурыць цыгарэту, а там жонка суп пачала гатаваць.
Прыйшлося бульбу абіраць.
* * *
Жонка і муж.
— Што за жыццё? Мы нікуды не ходзім: ні ў кіно, ні ў тэатр.
— Што ты глупства кажаш, а каго я летась адвёз у паліклініку з паламанай нагой?

## «НН» сто гадоў з вамі

**Францыя.** Муасан на аэраплане (на машыне для лятання) праляцеў па паветры з Парыжа ў Лондан — над морам.. Гэта паказвае, якую аграмадную вагу хутка будуць мець машыны для лятання.

**«НН». № 31. 1910.**

**Хто за праўду?** У новай [прэзідэнцкай] кампаніі ўсе хочуць вылучыць «самага прахаднога» кандыдата. А мне не важна, прахадны, не прахадны. Бо калі прахаднога, дык трэба нейкага Гайдукевіча вылучаць. Мне важна, каб хоць адзін у спісе такі быў, які за праўду. Каб быў упарты й нястомны. І каб ён у праграме сказаў шчыра, адкрыта і без чігірікання: што ж з бамжамі нам у вёсцы рабіць?

**Уляна Баран**
**«НН». № 34. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) Пяць. 2) Па адным яблыку. 3) Чатыры.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6370.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 24.08.2010.
Замова № 4117.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10032